ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СУБОТА, 11 ЧЭРВЕНЯ 1938 г. № 32 (374) Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАННЕ ДЭЛЕГАТАМ XVII З'ЕЗДА КП(б)Б!

АГІТАВАЦЬ ЗА КАНДЫДАТАЎ СТАЛІНСКАГА БЛОКА

10 чэрвеня адкрыўся XVII з'езд Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі. З'езд будзе праводзіць сваю работу ў разгар падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет БССР, у часе разгортвання агітацыі за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, зарэгістраваных па выбарчых акругах. Большэвіцкі з'езд падвядзе вынікі барацьбы партыі і ўсяго народа за росквіт соцыялістычнай радзімы пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі, вынікі барацьбы з заклятымі ворагамі совецкага народа— трацкісцка-бухарынскімі шпіёнамі і дыверсантамі, нацыянал-фашыстамі, якія хацелі адарваць Совецкую Беларусь ад вялікага Совецкага Саюза і аддаць свабодны народ у рабства фашызму. XVII з'езд КП(б)Б намеціць мерапрыемствы для далейшага росту ордэнаноснай краіны, для забеспячэння поўнай перамогі сталінскага блока комуністаў і беспартыйных на выбарах у Вярхоўны Совет БССР.

Час выбараў у Вярхоўны Совет БССР набліжаецца. Зарэгістраваны ўжо ўсе кандыдаты сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, вылучаныя на выбарчых сходах. Па выбарчых участках кандыдаты ў дэпутаты Вярхоўнага Совета рэспублікі сустракаюцца са сваімі выбаршчыкамі, выступаюць з прамовамі, расказваюць пра сваё жыццё і барацьбу за ўрачыстасць соцыялізма. Тут-жа выступаюць са сваімі сардэчнымі прамовамі рабочыя, калгаснікі, чырвонаармейцы, людзі навукі і тэхнікі. Прамова кожнага з іх — гэта голас усяго народа вялікай бацькаўшчыны аб поспехах, здабытых за дваццаць год совецкай улады пад мудрым кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, аб адданасці справе комунізма, сваёй радзіме аб росце людзей з глыбінь народных.

Выбарчая кампанія ўступіла ў рашаючы этап, калі трэба па-большэвіцку агітаваць за абранне ў Вярхоўны Совет вылучаных і зарэгістраваных выбарчымі камісіямі кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

На XI з'ездзе партыі В. І. Ленін так гаварыў пра агітацыю і прапаганду:

«Яснасць прапаганды і агітацыі ёсць асноўная ўмова. Калі нашы супрацоўнікі гаварылі і прызнавалі, што мы зрабілі цуды ў развіцці агітацыі і прапаганды, то гэта трэба разумець не знешнім чынам, што ў нас шмат было агітатараў і было патрачана шмат паперы, а гэта трэба разумець унутраным чынам, што тая праўда, якая была ў гэтай агітацыі, прабівалася ў галовы ўсіх. І ад гэтай праўды адхіліцца нельга».

Справа заключаецца іменна не ў колькасці вылучаных агітатараў і прапагандыстаў, а ў якасці, ва ўменні правільна давесці большэвіцкае слова да народных мас, да выбаршчыкаў, у сістэматычным кіраўніцтве і праверцы іх работы партыйнымі арганізацыямі. Агітацыя і прапаганда за кандыдатаў у дэпутаты павінна быць яркай, канкрэтнай і дзелавой, палітычна завостранай, праўдзівай і зразумелай кожнаму выбаршчыку.

Трэба не забываць, што выбаршчыкі не ўсе аднолькавага культурнага і палітычнага ўзроўню. Таму агітацыйна-прапагандысцкая работа, якая праводзіцца агітатарамі, павінна быць дыферэнцыраванай.

«У агітацыі за кандыдата першая роля належыць davераным асобам» («Праўда»). Яны разам з агітатарамі праводзілі работу ў мінулагодніх выбарах у Вярхоўны Совет СССР. Зараз, маючы вопыт агітацыі і прапаганды, даверaныя асобы разам з агітатарамі павінны правесці работу з выбаршчыкамі яшчэ лепш, чым у мінулым годзе. Але нельга пакідаць даверaных асоб і агітатараў без штодзённай дапамогі і кіраўніцтва.

За кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных на выбарах у Вярхоўны Совет БССР трэба сабраць ўсе галасы выбаршчыкаў. Гэта баявая задача партыйных, комсамольскіх арганізацый, даверaных асоб, агітатараў і ўсёй грамадскасці.

Галоўны цэнтр, штаб агітацыйна-прапагандысцкай работы — выбарчы ўчастак. Даверaным асобам і агітатарам тут шырокае поле для дзейнасці і ініцыятывы. Удзячная глеба тут і для работнікаў літаратуры і мастацтва. Але абмяжоўвацца работай толькі на ўчастку нельга. Работа з выбаршчыкамі павінна праводзіцца ўсюды — на заводах і фабрыках, у цэхах, у калгасах, у брыгадах на полі і на даму.

У мінулым годзе Саюзам совецкіх пісьменнікаў па ініцыятыве партыйнай і комсамольскай арганізацый было арганізавана багата выступленняў паэтаў і пісьменнікаў на выбарчых участках па выбарах у Вярхоўны Совет СССР. Паэты напісалі вершы і песні, прысвечаныя кандыдатам у дэпутаты. Кампазітары пераклалі вершы на музыку, друкавалі іх у газетах для масавага распаўсюджання. Прымалі актыўны ўдзел у выбарах калектывы тэатраў, Філармоніі, мастакоў.

Але мінулагодні вопыт не поўнасцю ўлічан, не памножан, не знойдзены новыя формы работы. На нарадзе актыва работнікаў мастацтваў, якая нядаўна адбылася, абмяркоўвалася пытанне ўдзелу работнікаў мастацтваў у падрыхтоўцы па выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Было высветлена, што ўсе тэатры прымаюць удзел у агітацыі за выбары ў Вярхоўны Совет. Дзяржаўны Віцебскі драматычны тэатр, Дзяржаўны Яўрэйскі тэатр, Дзяржаўны Рускі тэатр, Тэатр юнага гледача, соўгасна-калгасныя тэатры, Філармонія выязджаюць з канцэртнымі брыгадамі на выбарчыя ўчасткі, на заводы і фабрыкі, у калгасы, перад спектаклямі паказваюць інтэрмедыі, прысвечаныя выбарам. Але гэтага недастаткова.

Агітбрыгады тэатраў не разгарнулі работы па агітацыі за кандыдатаў, не спалучылі агітацыйнай работы з паказам дасягненняў соцыялістычнай радзімы за дваццаць год. Рэпертуар тэатраў не заўсёды добраякасны. Не дрэнна, што тэатры даюць выбаршчыкам канцэрты. Але канцэртную работу трэба будаваць так, каб кожнае мастацкае слова са сцэны і эстрады агітавала выбаршчыкаў, расказвала ім пра кандыдатаў у дэпутаты, пра перамогі на франтах будаўніцтва соцыялістычнай радзімы.

Пісьменнікі і паэты напісалі багата нарысаў пра кандыдатаў, абраннікаў народа. Гэта — аповесці пра рост людзей у Сталінскую эпоху. Біяграфіі кандыдатаў — гэта яскравыя прыклады перамог Сталінскай Канстытуцыі, перамог і заваёў Вялікага Кастрычніка. Агітбрыгады тэатраў павінны данесці да выбаршчыкаў мастацкае слова пра жыццё і барацьбу за справу Леніна—Сталіна нашых кандыдатаў, зачытваць гэтыя нарысы перад выбаршчыкамі на ўчастках, на прадпрыемствах, са сцэны і эстрады.

Усе пісьменнікі і паэты працуюць над нарысамі пра кандыдатаў у дэпутаты. Але гэтага недастаткова. Пісьменнікі павінны быць першымі агітатарамі жывым мастацкім словам на выбарчых участках, на заводах і фабрыках, у соўгасах і калгасах. Напісаны нарыс, верш яны павінны давесці да выбаршчыкаў.

Выклікае абурэнне работа Дзяржаўнага выдавецтва БССР. Па сёнешні дзень Выдавецтва не змагло выдаць ні адной аднаактавай п'есы, мастацкага зборніка да выбараў, ні адной песні, якія даўно напісаны пісьменнікамі і кампазітарамі. Выдатны паэтычны твор, напісаны да выбараў групай лепшых беларускіх паэтаў, — «Радзіме і правадыру», — яшчэ ўсё знаходзіцца ў друку, і калі выйдзе ў свет — невядома.

Маючы ўсе магчымасці для шырокага разгортвання агітацыйнай работы, Белдзяржкінохроніка да гэтага часу таксама не выпусціла на экраны кінотэатраў хвалюючых, цікавых кінонарысаў пра кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР і амаль нічога ў гэтым напрамку не робіць.

Да дня ўсенароднага свята — дня выбараў у Вярхоўны Совет БССР засталося 15 дзён. Усю работу Саюза пісьменнікаў, калектываў тэатраў, мастацкіх устаноў трэба падначаліць адной справе — агітацыі за стопроцантны ўдзел выбаршчыкаў у галасаванні за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

СКЛАД ГАНАРОВАГА ПРЭЗІДЫУМА XVII З'ЕЗДА КП(б)Б

СТАЛІН І. В.
МОЛАТАЎ В. М.
КАГАНОВІЧ Л. М.
ВАРАШЫЛАЎ К. Е.
КАЛІНІН М. І.
МІКАЯН А. І.
АНДРЭЕЎ А. А.
ЕЖОЎ Н. І.
ЖДАНАЎ А. А.
ЧУБАР В. Я.
ХРУШЧОЎ Н. С.
ДЗІМІТРАЎ Г. М.
ТЭЛЬМАН
ХОЗЕ ДЫЯС

КІРУЮЧЫЯ ОРГАНЫ XVII З'ЕЗДА КП(б)Б

Склад прэзідыума XVII з'езда КП(б)Б

Волкаў А. А.	Шыбалка В. Г.
Мехліс Л. З.	Петроў М. П.
Левіцкі А. М.	Кавалёў М. П.
Макараў І. Н.	Голікаў Ф. І.
Новік С. Я.	Валчкоў Е. К.
Наседкін А. А.	Раманенка С. М.
Масленнікаў І. І.	Горзў Н. В.
Клімовіч А. В.	Кавалёў П. Е.
Цветкоў А. Ф.	Матвееў А. П.
Курган І. М.	Савіцкі П. П.
Герман М. Е.	Лісоўскі М. К.
Пастухоў Ф. І.	Наталевіч Н. Я.
Кавалькоў І. Д.	Рэпінскі М. Я.
Маркін Д. Ф.	Гаўрылаў
Кавалёў А. Ф.	Пігурноў А. П.
Ананьеў А. А.	Остроўская М. М.
Уралава Е. І.	Субоцін Т. Ф.
Матлахоў Д. А.	

Склад мандатнай камісіі XVII з'езда КП(б)Б

Гусеў Д. С.	Небышынец Н. Е.
Байцоў Ф. С.	Казачонак
Новічэнкаў Я. Ф.	Васільеў Г. А.
Снегаў Ф. П.	Васільеў І. В.
Ігаеў С. С.	Седых В. Я.
Бляеў С. М.	Якушэва Т. І.
Былінскі В. П.	

Сакратарыят XVII з'езда КП(б)Б

Смоляр В. П.	Малін В. Н.
Кулагін М. В.	Грэк Н. Г.
Будзько Я. К.	Бандарэнка Г. П.
Брыкаў А. Д.	Офенгейм І. М.
Новікава Ф. А.	Нікіфарава М. Ф.
Бедзін В. В.	

ДЗЁННІК З'ЕЗДА

10 чэрвеня ў зале пасяджэнняў Дома ўрада адкрыўся XVII з'езд Комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі.

Да 5 гадзін дня зала запаўняецца дэлегатамі з'езда. Усяго на з'ездзе прысутнічае 411 дэлегатаў з правам рашаючага і 125 з правам дарадчага голасу.

За сталом прэзідыума паяўляецца выконваючы абавязкі першага сакратара ЦК КП(б)Б тав. Волкаў. Адкрываючы з'езд тав. Волкаў гаворыць яркую і красачную прамову.

У зале доўга не змаўкаюць апладысменты і прывітальныя воклічы ў гонар вялікага Сталіна. Дэлегаты з'езда стоячы вітаюць таварыша Сталіна. Раздаюцца воклічы:—Няхай жыве вялікі Сталін! Ура таварышу Сталіну!

Захапляючай авацыяй сустракаюць дэлегаты з'езда прапанову выбраць у склад ганаровага прэзідыума геніяльнага правадыра партыі і ўсяго працоўнага чалавецтва таварыша Сталіна.

З вялікім натхненнем і любоўю пад буру апладысментаў дэлегаты з'езда выбіраюць у ганаровы прэзідыум бліжэйшых саратнікаў вялікага Сталіна, членаў Палітбюро, а таксама таварышаў Дзімітрава, Тэльмана і Хозе Дыяса.

Новай магутнай хваляй энтузіязма і захаплення, пры бурнай авацыі, прымаецца прапанова аб выбранні таварыша Сталіна ганаровым старшынёй XVII з'езда КП(б)Б.

Пасля выбараў ганаровага прэзідыума з'езд выбраў мандатную камісію ў складзе 13 чалавек і сакратарыят у складзе 11 чалавек.

З'езд зацвердзіў наступную павестку дня: справаздача ЦК КП(б)Б, справаздача рэвізійнай камісіі, выбары ЦК і рэвізійнай камісіі.

У першай частцы справаздачы тав. Волкаў падрабязна спыніўся на рабоце, праведзенай КП(б)Б па выкрыццю і разгрому трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх шпіёнаў, аб рабоце па вылучэнню маладых большэвіцкіх кадраў і на пытаннях арганізацыйна-партыйнай работы. Працяг даклада тав. Волкава перанесен на сёнешняе пасяджэнне з'езда.

УСТУПНАЯ ПРАМОВА ВЫКОНВАЮЧАГА АБАВЯЗКІ ПЕРШАГА САКРАТАРА ЦК КП(б)Б тав. А. А. ВОЛКАВА

Таварышы, сёння мы адкрываем XVII з'езд Комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі, на якім нам прадстаіць з вамі падвесці вынікі работы большэвікоў Совецкай Беларусі за прайшоўшы справаздачны год і намеціць чарговыя задачы далейшай работы.

Таварышы, прайшоўшы год за час з XVI з'езда Комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі быў годам, поўным буйнейшых падзей у палітычным жыцці нашай партыі і краіны, быў годам велізарнейшых перамог на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва, быў годам разгрому і выкарчоўвання ворагаў народа, япона-германскіх, трацкісцка-бухарынскіх агентаў фашызма.

Гэта нам забяспечыла выкананне гістарычных рашэнняў лютаўска-сакавіцкага Пленума, гістарычных указанняў нашага вялікага правадыра і настаўніка, друга беларускага народа — таварыша Сталіна. **(Бурныя апладысменты, пераходзячыя ў авацыю. Воклічы — «ура вялікаму Сталіну — ура!»).**

Таварышы, указанні таварыша Сталіна мабілізавалі ўсю партыю на разгром і выкарчоўванне ворагаў і на ліквідацыю ідыёцкай хваробы — бесклапотнасці — у радах нашай партыі.

Народы нашай вялікай краіны ў лістападзе месяцы прайшоўшага 1937 года святкавалі вялікае свята—20-годдзе Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, адзначалі 20-гадовы шлях нашай барацьбы і перамог. За гэтыя 20 год наша партыя і краіна атрымалі найвялікшыя перамогі ў будаўніцтве соцыялізма ў нашай краіне, выдатна выражаныя ў вялікім гістарычным дакуменце — Сталінскай Канстытуцыі СССР.

Яркім прыкладам росту магутнасці і моцнасці нашага совецкага ладу з'яўляюцца найвялікшыя дасягненні нашай Совецкай Беларусі, якая за годы совецкай улады, дзякуючы няўхільнаму правядзенню ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, ператварылася ў квітнеючую краіну з магутнай індустрыяй, у краіну буйнай сельскай гаспадаркі, дзе квітнее культура — нацыянальная па форме і соцыялістычная па зместу.

На аснове правядзення ў жыццё Сталінскай Канстытуцыі Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік — наша партыя Леніна—Сталіна і краіна ажыццявілі паварот у палітычным жыцці краіны.

Выдатнай падзеяй у жыцці народаў Совецкага Саюза былі выбары ў Вярхоўны Совет СССР на аснове Сталінскай Канстытуцыі, на аснове ўсеагульнага, прамога, роўнага выбарчага права грамадзян пры тайным галасаванні. Гэтыя гістарычныя выбары, таварышы, паказалі працоўным усяго свету нябачанае ў гісторыі маральна-палітычнае адзінства совецкага народа, яго несакрушальную магутнасць і баявую згуртаванасць вакол нашай партыі, вакол совецкага ўрада, вакол таварыша Сталіна. **(Бурныя, працяжныя апладысменты).**

Таварышы, перамога нашай партыі ў выбарах на аснове сталінскага блока комуністаў і беспартыйных паказала, якой любоўю карыстаецца наша большэвіцкая партыя ў вялікага совецкага народа, які моцны саюз нашай партыі з найшырэйшымі масамі працоўных, якую велізарную сілу ў нашай краіне мае блок комуністаў і беспартыйных. **(Апладысменты).**

У нашай краіне, таварышы, злучыліся ў адно цэлае — па выражэнню таварыша Молатава — дзве вялікія пераможныя сілы — народ і комунізм. **(Апладысменты).**

Таварышы, вялікая сіла нашай дзяржавы, яе магутнасць — несакрушальны. Наш новы соцыялістычны лад, не гледзячы на зверскае супраціўленне ворагаў нашай вялікай радзімы, ідзе ўсё з большымі перамогамі да комунізма.

Прайшоўшы 1937 год быў годам упартай барацьбы нашай партыі, кожнай яе арганізацыі за выкананне рашэнняў лютаўска-сакавіцкага Пленума Цэнтральнага Камітэта Усесаюзнай комуністычнай партыі (большэвікоў) і ўказанняў таварыша Сталіна, зробленых ім на Пленуме ў дакладзе — «Аб недахопах партыйнай работы і мерах ліквідацыі трацкісцкіх і іншых двурушнікаў».

Выкананне рашэнняў лютаўска-сакавіцкага Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна з'явілася адной з асноўных і буйнейшых перамог нашай партыі. Асіныя гнёзды злейшых ворагаў народа — трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх бандытаў — разгромлены. А колькі надзей на гэтую прэзрэнную банду з вялікай дарогі ўкладалі фашысцкія замежныя разведкі, як многа разлікаў было ў гэтых фашысцкіх паноў у правядзенні падрыўной работы ўнутры нашай краіны для таго, каб аслабіць яе на выпадак узброенага нападу і паставіць у цяжкае становішча ў часе вайны.

Паны фашысты і на гэты раз праліčыліся. Як і заўсёды, — іх стаўка біта. Наша слаўная совецкая разведка, на чале з любімым сталінцам—Нікалаем Іванавічам Ежовым **(бурныя апладысменты)**, пры дапамозе ўсяго совецкага народа,—разбурыла каварныя задумы фашыстаў, злобна апплакваючых зараз гэту прэзрэнную банду.

Апошні працэс над трацкісцка-бухарынскай бандай паказаў, якую страшэнную здрадніцкую работу вялі гэтыя гады, як яны выкручваліся і маскіраваліся. Таму важнейшы ўрок прайшоўшага года заключаецца ў тым, што наша партыя, кожны комуніст, кожны партыйны і непартыйны большэвік зразумелі, якую небяспеку стварае бесклапотнасць, залішняя даверлівасць, як дорага каштуе яна нашай краіне.

Таварыш Сталін вучыць нас, што «цяпер вузлавым пытаннем для нас з'яўляецца не ліквідацыя тэхнічнай адсталасці нашых кадраў, бо яна ў асноўным ужо ліквідавана, а ліквідацыя палітычнай бесклапотнасці і палітычнай даверлівасці да шкоднікаў, выпадкова атрымаўшых партыйны білет».

Так гаварыў таварыш Сталін год таму назад, так ён вучыў і вучыць нашу партыю.

Гэтымі днямі, адкрываючы ленінградскую гарадскую партыйную канферэнцыю, сакратар ЦК нашай партыі тав. Жданаў сказаў:

«Урок гэтага года заключаецца ў тым, што мы больш чым калі-б там ні было зразумелі небяспеку бесклапотнасці, залішняй даверлівасці ў нашых радах, зразумелі, чаго каштуе нам гэта. І ў справе павышэння нашай пільнасці, мабілізацыі партыі і народа на барацьбу, на ліквідацыю трацкісцка-бухарынскіх і іншых шпіёнаў, агентаў замежных контрразведак, у гэтай справе, як і ва ўсіх справах нашай партыі, рашаючая роля належыць зоркасці, мудрасці нашага правадыра і настаўніка таварыша Сталіна».

(Усе ўстаюць, бурныя, доўга незмаўкаючыя апладысменты).

Таварышы, асабліва сур'ёзны ўрок у прайшоўшым годзе атрымала Комуністычная партыя большэвікоў Беларусі ў разгроме фашысцкай агентуры, прабраўшайся ў нашу партыю і да кіраўніцтва ЦК, гаспадарчымі і совецкімі арганізацыямі. Гэтыя прэзрэнныя нацыянал-фашысты, прадажныя псы фашысцкіх разведак, злейшыя ворагі беларускага народа сваёй шкодніцкай, падрыўной дзейнасцю нанеслі не малую шкоду беларускаму народу. Яны рабілі ўсё для таго, каб падарваць магутнасць нашай совецкай рэспублікі, як баявога фарпоста на заходняй граніцы, яны рабілі ўсё, каб адарваць нашу совецкую рэспубліку ад вялікай сям'і народаў Совецкага Саюза і аддаць беларускі народ у лапы крывавага фашызма.

Цяпер гэтыя бандыты выкрыты і знішчаны, і гэтым мы перш за ўсё абавязаны Цэнтральнаму Камітэту Усесаюзнай комуністычнай партыі большэвікоў, нашаму правадыру і настаўніку, другу беларускага народа таварышу Сталіну. **(Усе ўстаюць, бурныя доўга незмаўкаючыя апладысменты).**

Таварыш Сталін нястомна сваёй пільнасцю і празорлівасцю аберагае нашу партыю, народы нашай краіны ад усіх ворагаў, якія пасягаюць на мірнае жыццё нашай краіны, ад іх каварных замыслаў.

Нямала шпіёнаў, дыверсантаў, прэзрэнных здраднікаў радзімы выкрылі большэвікі Беларусі за гэты прайшоўшы год. Нямала зроблена па выкарчоўванню астаткаў прэзрэнных здраднікаў і шпіёнаў.

Вялікую работу правяла наша партыя па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў партыйным апараце, у прамысловасці, у сельскай гаспадарцы, у культурным будаўніцтве. Але мы, таварышы, большэвікі Совецкай Беларусі, не павінны ні на мінуту забываць, што Беларусь і надалей будзе цэнтрам прыцягнення ўсёй гэтай фашысцкай нечысці; мы не павінны ні на мінуту забываць аб тым, што мы жывем, працуем з вамі ў Совецкай Беларусі на рубяжы двух светаў. Наша рэспубліка з'яўляецца баявым фарпостам на заходніх граніцах нашага вялікага Совецкага Саюза, і гэта нас абавязвае яшчэ вышэй падняць сцяг большэвіцкай пільнасці, узмацніць барацьбу па выкарчоўванню варожых элементаў і быць заўсёды гатовымі ў любы момант даць адпор усім, хто пасмее пасягнуць і пераступіць нашы свяшчэнныя граніцы. Парукай таму, што будзе дан знішчальны адпор, з'яўляецца тое, што наша краіна, сталінская эпоха мае такую пераможную Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію, якая пад кіраўніцтвам слаўнага баявога саратніка вялікага Сталіна — Клімента Ефрэмавіча Варашылава будзе граміць ворага на той тэрыторыі, адкуль ён прыдзе. **(Усе ўстаюць, бурныя апладысменты, воклічы «ура»).**

Таму, таварышы, работнікам Беларусі, комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі трэба ў сваёй практычнай рабоце праяўляць яшчэ большыя клопаты аб нашай Чырвонай Арміі і выканаць з гонарам і ў тэрмін усе абавязацельствы, якія мы з вамі ўзялі на сябе па ўмацаванню магутнасці Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

Таварышы, праводзячы вялікую работу па выкрыццю і выкарчоўванню ворагаў народа, наша партыя правяла вялікую работу па ўмацаванню важнейшых участкаў нашага партыйнага, совецкага і гаспадарчага апарата.

Мы правялі велізарнае вылучэнне на партыйную дзяржаўную, гаспадарчую работу новых кадраў партыйных і непартыйных большэвікоў, здольных арганізатараў, беззаветна адданых справе нашай партыі Леніна — Сталіна, Цэнтральнаму Камітэту Усесаюзнай Комуністычнай партыі большэвікоў і таварышу Сталіну. **(Бурныя, доўгія апладысменты, усе ўстаюць).**

Гэтыя новыя кадры ўнеслі ў работу партыйных, совецкіх і гаспадарчых арганізацый высокую большэвіцкую прынцыповасць, дабіліся поспехаў у справе ліквідацыі вынікаў шкодніцтва. Але гэта толькі пачатак нашай работы. Многа яшчэ ўчасткаў нам прадстаіць умацаваць у нашай далейшай рабоце, і было-б зусім няправільна думаць, што мы ўсё зрабілі па ачышчэнню нашых партыйных, совецкіх і гаспадарчых органаў ад ворагаў, ад людзей разлажыўшыхся і іншых варожых элементаў.

Нам прадстаіць многа папрацаваць, каб выкарчаваць астаткі трацкісцка-бухарынскіх, нацыянал-фашысцкіх агентаў і рашуча вышыбаць іх з нашых апаратаў.

Трэба пастаянна памятаць вялікае вучэнне таварыша Сталіна аб тым, што «неабходна памятаць і ніколі не забываць, што капіталістычнае акружэнне з'яўляецца асноўным фактам, вызначаючым міжнароднае становішча Совецкага Саюза».

Таварышы, XVII з'езд Комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі павінен прайсці пад сцягам большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі. Мы павінны ўскрыць усе нашы недахопы ў рабоце, а іх яшчэ вельмі многа. Мы павінны намеціць шляхі да іх хутчэйшай ліквідацыі, каб больш павысіць большэвіцкую боездольнасць, згуртаванасць нашых радоў, яшчэ паспяховей рашаць стаячыя перад намі палітычныя і гаспадарчыя задачы.

Мы павінны правесці свой большэвіцкі XVII з'езд так, каб крытычна праверыць усю работу Цэнтральнага Камітэта і яго апарата і партыйных арганізацый па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва. Мы павінны забяспечыць поўнасцю выкананне дзяржаўных мерапрыемстваў як у прамысловасці, ў сельскай гаспадарцы, так і гарадскім будаўніцтве.

Мы павінны яшчэ больш рыхтаваць усю нашу партыйную арганізацыю да прадстаячых выбараў у Вярхоўны Совет БССР, каб гэтыя выбары прайшлі яшчэ лепш, яшчэ больш арганізавана, бо мы маем з вамі найвялікшае шчасце ў тым, што ў нашай Совецкай Беларусі будуць балатыравацца нашы правадыры і кіраўнікі — вялікі Сталін і яго баявыя саратнікі—члены Палітбюро. **(Бурныя, доўгія апладысменты, пераходзячыя ў авацыю).**

Гэтую найвялікшую гордасць і радасць мы павінны апраўдаць так, каб пабудаваць работу ў выбарчай кампаніі пад лозунгам стопроцантнай яўкі і галасавання за ўсіх кандыдатаў у дэпутаты і за першага, лепшага з лепшых кандыдатаў у дэпутаты, нашага вялікага, роднага таварыша Сталіна. **(Бурныя, доўгія апладысменты, пераходзячыя ў авацыю)**

Таварышы, Комуністычная партыя большэвікоў Беларусі прышла да свайго з'езда адзінай, згуртаванай, боездольнай, маналітнай, гатовай рашуча і да канца біцца за выкананне пастаўленых задач перад ёю Цэнтральным Камітэтам ВКП(б) і нашым дарагім таварышам Сталіным **(доўгія апладысменты)** і мы абавязаны зрабіць усё, каб наша Комуністычная партыя большэвікоў Беларусі была і надалей вернай апорай сталінскага Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), прыкладам большэвіцкай арганізаванасці, згуртаванасці ў далейшай барацьбе за выкананне рашэнняў нашай партыі і ўказанняў нашага мудрага, вялікага правадыра і настаўніка таварыша Сталіна. **(Бурныя, доўгія апладысменты)**

Няхай жыве вялікая і непераможная партыя Леніна — Сталіна. **(Апладысменты).**

Няхай жыве вялікі сцяг Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна! **(Апладысменты).**

Няхай жыве ленінска - сталінскі Цэнтральны Камітэт! Няхай жыве наш вялікі правадыр, настаўнік, родны і вялікі Сталін! Ура! **(Бурныя, доўга незмаўкаючыя апладысменты, пераходзячыя ў авацыю. З усіх канцоў зала раздаюцца воклічы: таварышу Сталіну ура! Вялікаму любімаму Сталіну ура! Правадыру соцыялістычных перамог таварышу Сталіну ура!).**

Таварышы, выбрана і павінна з'явіцца дэлегатаў на XVII з'езд Комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі з рашаючым голасам 438 чалавек, з дарадчым голасам — 127 чалавек. Усяго павінна з'явіцца 565 чалавек. З'явілася і зарэгістравалася з рашаючым голасам 411 чалавек, з дарадчым голасам 125 чалавек, усяго з'явілася і зарэгістравалася 536 чалавек.

Такім чынам, з'езд наш з'яўляецца правамоцным. Дазвольце па даручэнню пленума ЦК Комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі абвясціць XVII з'езд адкрытым. **(Бурныя апладысменты).**

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

АБ УЗНАГАРОДЗЕ ПІСЬМЕННІКА ТРЭНЕВА К. А. ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА

У сувязі з 40-годдзем літаратурнай дзейнасці ўзнагародзіць тав. **Трэнёва Канстанціна Андрэевіча** за выдатныя заслугі ў развіцці совецкай драматургіі ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
10 чэрвеня 1938 г.

Кандыдаты сталінскага блока комуністаў і беспартыйных

Пётр Васільевіч САРОКІН

Памяць аднаўляе даўняе, падобнае на чорны сон...

Прыходзіў Пётр Сарокін дадому, яго сустракала заплаканая жонка і моўчкі паказвала на павыбіваныя шыбы. Усё было зразумела, верадзіла даўно набалелае, абрыдлае:

— Ігнат гэта... Зноў кура забрыла на яго загон...

Апанаваны цяжкімі думамі, Сарокін застываў ля хаты. Перад ім — шматок зямлі, на якім нехапала разгону нават для курыцы. Глядзеў у далячынь



Кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР па Селюцкай выбарчай акрузе Віцебскага раёна.

— за паплавы, за Лучосу, — недзе там кавалак забалаці, Сарокінаў надзел. Да яго і дабрацца няма як...

— Хоць ты мост будуй... — прыкра ўсміхаўся Сарокін.

Што рабіць? Быў адзін толькі выхад. Гэта ўжо даўно разумеў кандыдат партыі Пётр Сарокін, але гэтага не разумеў яшчэ Ігнат, астатнія суседзі:

— Трэба разбіць нікчэмныя мары хутаранаў, трэба злучыць усе палеткі ў адно разложыстае, калектыўнае поле... Каб Жукі, Алёніна і Фёдараўка зажылі адным жыццём, адным імкненнем.

Доўга гаварыў Сарокін з братамі, з суседзьмі, і вось на пасёлку Фёдараўка Шумнянскага сельсовета арганізаваўся калгас. Пятра Сарокіна, які меў ужо вопыт работы ў камітэце беднаты і ў сельсовеце, абралі за старшыню. Невялічкі калектыў дружна ўзяўся за агітацыйную работу, і на першую калектыўную сяўбу ў 1931 годзе выйшла ўжо 28 калгаснікаў.

Пачынаўся новы прыліў у калгас. Класавы вораг засылаў у калгас сваіх лазутчыкаў — падрыўнікаў калгаснага ладу, падкулачнікаў. Памяць аднаўляе трывожныя падзеі. У 1932 годзе брыгада, што жыла ў Жуках, раптам пахавала інвентар і не выйшла на ворыва. Падбухтораныя падкулачнікамі, члены брыгады не слухалі ўгавораў старшыні калгаса. Сабатаж быў разбіт толькі тады, калі на ворыва ў Жукі перакінулі другую брыгаду. Пасля ў калгасе пачаўся крадзёж бульбы. Ночы не спаў старшыня, сам пільнаваў,— злодзеі былі спайманы за руку. У 1934 годзе вораг зноў узняў галаву, ён правёў сваю падрыўную работу ў часе касьбы: 10 касцоў не скасілі за дзень і аднаго гектара сенажаці. Сарокін арганізуе выязное пасяджэнне праўлення калгаса ў брыгадзе, прымацоўвае да яе члена праўлення. І зноў варожая вылазка была разбіта.

Так, у барацьбе за ўмацаванне калгаса, за чыстату яго радоў рос і загартоўваўся нязменны старшыня калгаса Пётр Васільевіч Сарокін, цвёрды большэвік, які ясна бачыў сваю мэту і ўпэўнена ішоў да яе. Рос, мацнеў калгас «Пяцігодка за чатыры годы», заўсёды выконваючы свае планы, і стаў перадавым у раёне. У яго ўваходзіла ўжо 86 гаспадарак.

Набываў Пётр Сарокін вопыт, выяўляў гаспадарлівасць, ініцыятыву. Нехапала ўгнаення для калгасных палёў —Сарокін арганізаваў тарфаванне. Шмат было забалаці на калгасным масіве — па ініцыятыве Сарокіна капаюцца канавы, а гэта прыводзіць да больш грунтоўнага мерапрыемства — меліярацыі балота. І вось адваявана ад вады 90 гектараў зямлі, з іх 20 гектараў узнята пад віку, а рэшта стала спажыўным выпасам. Не мог здаволіць калгаса двухгектарны пладовы сад былога маёнтка, — арганізуецца пасадка новага саду на 25 гектарах. Следам засяваецца 3 гектары лесу, рыхтуецца чарговы падсеў калгаснага лесу.

Стаіць Пётр Сарокін у цэнтры калгаснага масіва. Перад ім школа, яслі, новы калгасны клуб, вялікія аборы. У аборах 149 сытых кароў, 98 свіней лепшай пароды. З узгорку відаць багатую сакавітую рунь на калгасных палях. З іх калгас збірае па 18 цэнтнераў ячменю і пшаніцы, па 15 цэнтнераў жыта з гектара.

***

На сходах выбаршчыкаў Селюцкай выбарчай акругі ў дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР аднаадушна была вылучана кандыдатура Пятра Васільевіча Сарокіна.

Усхваляваны, позна вечарам вярнуўся дадому Сарокін. Запаліў лямпу. Агледзеў хату. Чыста пабеленую печ 14-гадовы сын яго Валодзя размаляваў каляровымі малюнкамі. Ён уклаў у іх усю сваю дапытлівасць, усю дзіцячую фантазію. Вось на стале акуратна складзены яго падручнікі. вось вісіць на сцяне яго чысценькі партфель. Сарокін з цёплай усмешкай глядзіць на заружавелы ў сне твар сына. І памяць зноў аднаўляе далёкае, жудаснае мінулае. Яму, Пецю Сарокіну, 7 год. Бацька дае яму ў рукі пугу:

— Ідзі, сынок, пасвіць жывёлу...

Сем рублёў у год атрымліваў Пеця за сваю катаргавую для дзіцяці работу. І так 6 год. Калі Пецю было 12 год, вялікае гора прышло ў хату яго бацькоў. Уначы ўварваліся стражнікі, яны скруцілі бацьку рукі, прывязалі яго рэменем да сядла і пагналі ў горад. Маці казала — за тое, што бацька падгаварыў аднавяскоўцаў пагнаць згаладалую жывёлу ў маёнтак на атаву. У тую-ж восень настаўніца — папова пляменніца не прыняла ў школу Пецю і яго сястру.

Пайшлі прасіцца да папа. Той паглядзеў на рукі прасіцеляў — і размаўляць не захацеў з «бунтаўнікамі». І толькі калі маці здагадалася прынесці папу курыцу і пеўня — атрымаў Пеця права на вучобу.

Ціха падыходзіць Пётр Васільевіч да ложка, рука яго пяшчотна дакранаецца да сынавай галавы. Сэрца ў яго поўніцца бязмежнай радасцю — за шчаслівых дзяцей, за сябе, за заможных калгаснікаў, за партыю і яе правадыра, мудрага Сталіна, за ўвесь народ, за высокае давер'е, якое аказаў яму, свайму сыну, гэты народ.

Ён апраўдае давер'е народа!

ХВ. ШЫНКЛЕР.

Анатолій Васільевіч БАГАТЫРОЎ

Яго жыццё склалася без агіднага ўплыву на маладую псіхіку хлусні і двудушнасці мінулага, без гнятучага ўплыву беспрасветнасці і нэндзы, — тав. Багатыроў фактычна нарадзіўся разам з Вялікім Кастрычнікам. Бо хоць і было яму чатыры годы ўжо, ён усяго толькі і памятае з жудаснай мінуўшчыны гул гарматнай страляніны, калі нямецкія імперыялісты бамбардыравалі крэпасць і горад Дзвінск. Гэта адно, што тоненькаю нітачкаю звязвае яго з мінулым; ён увесь у сучасным.



Кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР па Варашылаўскай выбарчай акрузе № 162 гор. Менска.

Першым свядомым праблескам, з якога пачалося фарміраванне чалавека, кампазітара і будучага кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, была рэволюцыя. Адгэтуль пачынае жыць Анатолій Васільевіч.

Ён вырас у сям'і віцебскага настаўніка, які і цяпер выкладае ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах рускую мову і літаратуру. Яго біяграфія пазбаўлена якіх-небудзь жудасных падзей, — маладое жыццё яго прайшло праз 25 год нябачанай у гісторыі чалавецтва эпохі прыгожаю раніцаю Левітана. Ён жвавы і бадзёры, яму невядомы шмат якія адчуванні, навеяныя іншым людзям старым светам. Напэўна асяроддзе інтэлігентнай сям'і настаўніка Багатырова пакінула свой выразны знак на ўсім характары Анатолія Васільевіча, а новы свет, новае грамадства напоўнілі яго актыўнасцю. Ён мяккі ў абыходжанні, удумлівы ў гутарцы і актыўны ў руху. Гэта якасці не толькі аднаго тав. Багатырова, гэта якасці новага пакалення, народжанага Кастрычнікам, якое раскошна расквітнела пад шчодрым сонцам соцыялістычнай свабоды, гэта — якасці новага свету, новага жыцця.

Анатолій Васільевіч любоў да музыкі адчуў рана, а з 11 год пачаў ужо нават пісаць невялічкія музычныя творы.

— Безумоўна, яны былі далёка не дасканалымі, — кажа тав. Багатыроў, — але я не пакідаў працы.

Адначасова з сярэдняю школаю ён наведваў і музычную ў гор. Віцебску. Першапачатковая музычная адукацыя яго канчаецца разам са сканчэннем сярэдняй школы ў 1930 годзе. У тым самым годзе тав. Багатыроў паступае ў Менскі музычны тэхнікум, у якім правучыўся два годы.

Ён не спыняецца на дасягнутым. Ён прагна імкнецца ўперад і ўперад. Перад ім шырокая дарога, — дарога пратаваная Кастрычнікам для сваіх дзяцей, для ўсяго працоўнага чалавецтва ў цудоўнае, прыгожае жыццё. Нябачаныя нікім магчымасці адкрыты перад дзецьмі працоўнага народа ў соцыялістычнай бацькаўшчыне. Здольнасці, таленты расцвітаюць, як бутоны прыгожых руж, квітнеючы пышнымі краскамі.

Пасля другога курса музычнага тэхнікума для Багатырова гасцінна адчыняюцца дзверы Дзяржаўнай Кансерваторыі, якую тав. Багатыроў і скончыў з поспехам у 1937 годзе па класу прафесара Залатарова — тэорыі і кампазіцыі.

Ворагі народа шкодзілі ўсюды і асабліва на гістарычным фронце. Не абышлося без іхных брудных рук і ў Кансерваторыі БССР. Толькі высокааўтарытэтнае слова Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна вярнула гісторыі, як навуцы, яе сапраўднае месца, паставіла яе на моцныя марксісцкія ногі.

— Вось чаму, — кажа Анатолій Васільевіч, — я адчуваў вялікую патрэбу ў дадатковай адукацыі, паміма Кансерваторыі, і, у прыватнасці, па гісторыі музыкі.

Прыходзілася, аднак, не толькі вучыцца. Маладая, бурлівая энергія шукае выйсця. Хочацца працаваць, тварыць і тварыць. Яшчэ будучы ў Кансерваторыі, тав. Багатыроў працуе піяністам у Эстрадбюро і канцэртмейстэрам у Оперным тэатры.

З 1933 года тав. Багатыроў пачынае сур'ёзную самастойную творчую работу. 20-годдзю Вялікага Кастрычніка ён прысвячае сімфонію, піша «Беларускае трыо» для раяля, скрыпкі і віялянчэлі, харавыя творы і рамансы на тэксты совецкіх паэтаў і, у прыватнасці, на тэксты народных паэтаў БССР—Янкі Купалы і Якуба Коласа; апрацоўвае народныя песні, піша паэму-казку для хора, салістаў і аркестра на тэкст А. С Пушкіна. Апошняю працаю яго з'яўляецца опера «Дрыгва» паводле аповесці Якуба Коласа «Дрыгва».

Тэмы творчасці маладога кампазітара Багатырова выразна сведчаць аб моцнай арганічнай сувязі яго з нашым жыццём, з народнымі масамі. Ён стварае сваю музыку пра народ, пра перамогі народа і для народа. Не зважаючы на шырокае кола абавязкаў, якія ляжалі на ім, тав. Багатыроў тым не менш аддае не мала часу грамадскай працы. Каля года кіруе ён музычнымі і харавымі гурткамі ў часцях Чырвонай Арміі, з брыгадаю Тэатра оперы і балета абслугоўвае раёны Палесся, вядучы музыкальную прапаганду сярод шырокіх працоўных мас. Адгэтуль і актуальнасць тэматыкі ў творчасці кампазітара А. Багатырова.

— Пасля «Дрыгвы» я вазьмуся за працу над новай операй — сучаснай альбо гістарычнай.

Будзьце ўпэўнены, таварышы выбаршчыкі Варашылаўскай выбарчай акругі, гэта яго мара будзе здзейснена. Ваш кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР створыць гэту оперу. Ён створыць не адну оперу пра шчаслівы совецкі народ, пра гераічны совецкі народ, пра непераможны совецкі народ. Ён будзе вашым надзейным пасланцом у Вярхоўным Савеце Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Р. МУРАШКА.

Фёкла Міхайлаўна ШАМКО

Па алеі парка скакала кавалькада. У доўгіх амазонках, падганяючы стэкамі палукровак, горда закінуўшы галовы, сядзелі ў сёдлах ганаровыя шляхцянкі. Паперадзі скакала тая самая француженка, любоўніца графа Чапскага, аб якой гаварыла ўся губерня і Варшава. Каля яе на кроўным англійскім рысаку імчаў сам пан, а за ім велізарная світа памешчыкаў усіх рангаў. Пераймаючы пана Чапскага, усе яны былі ў цыліндрах.

Раптам дарогу перабегла басаногая,



Кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР па Плiскай выбарчай акрузе № 149.

у бруднай, парванай сукенцы, дзяўчынка. Яшчэ імгненне і яна была-б затаптана нагамі гарэзлівых скакуноў. Хлыст пана Чапскага ўхаластую свіснуў у паветры, — дзяўчынка знікла за кустом. Хутка бегучы па парку, яна не бачыла, што па алеі скачуць госці пана. Яе спалох быў такі вялікі, што яна ледзь ачухалася праз колькі мінут. Вочы, напоўненыя слязьмі, глядзелі ўслед хутка аддаляўшайся расфранчанай світе.

Пан упраўляючы маёнтка бачыў гэтую сцэну. Батраку Міхаілу Жораву дасталося ад пана ўпраўляючага за тое, што яго «кодла» дазваляе сабе паяўляцца там, дзе яму хадзіць не дазволена, — гэта значыць у панскім парку, ды яшчэ кідацца пад ногі коням. Міхаіл Жораў пажурыў дачку Фяклушу, — не біць-жа яе, на самой справе, за тое, што прабегла па парку...

У той час Фяклушы было 13 год. Гэта было ў 1908 годзе. Шмат часу прайшло з таго часу, шмат вады сплыло. А жыццё сваё вось як помніць Фёкла Міхайлаўна; як на далоні яно, жыццё гэта, — цяжкое, горкае. З 13 год працаваць давялося. Не працаваць нельга было. У бацькі 12 малых, 12 ратоў. А заработак — тры пуды мукі ў месяц, — тры пуды аржаной мукі, выдаваемай з панскай каморы. Бацька — палявы рабочы ў панскім маёнтку з дзіцячых год, яго бацька таксама батрак.

Беспрасветнае жыццё ў сям'і батрака Міхаіла Жорава. Шаснаццацігадзінны рабочы дзень, голад, нястача, бізуны панскіх прыказчыкаў і даверaных. Калі Міхаіл Жораў жаніўся, дык боты ў мястэчку «на пракат» браў, і так усё жыццё без ботаў пражыў: не памерці-б толькі. Але паміралі дзеці — ад голаду, ад холаду. І жылі так вакол усе беднякі.

А побач было бліскучае, у раскошы, у непамерных лішках, перанасычанае забавамі, жанчынамі, якія выпісваліся з-за граніцы, жыццё яснавяльможнага пана Чапскага.

Трынаццацігадовая Фяклуша слабымі, непаслухмянымі рукамі, даіла кароў. Праца была непасільная, падлетак чахнуў. Аб навучанні Фяклушы грамаце нікому і ў галаву не прыходзіла.

Кароўнік, непасільная — з досвітку да ночы — праца была лёсам батрацкай дачкі. У шаснаццаць год бацькі аддалі яе замуж за батрака, — за такога-ж галыша, як яны самі.

Замужаства змяніла толькі прозвішча Жорава на Шамко, а нястача і непасільны цяжар працы засталіся тымі-ж. І так цягнулася доўгія годы. Жабрацкія дні, убогае жыццё...

Імперыялістычная вайна. Кастрычніцкая рэволюцыя. Уцёк у Парыж граф Чапскі. Маёнтак Шыкатовічы стаў соўгасам імя Я. П. Свердлова. Перад сям'ёй Фёклы Міхайлаўны адкрыліся гарызонты сапраўднага чалавечага жыцця. Не пакладаючы рук працавала яна з мужам, сазнаючы свае права ў новай соцыялістычнай працы. Стаць сапраўдным ударнікам у сваёй справе стала марай Фёклы Шамко, і яна ўпартай працай дабілася гэтага. У соўгасе панавала разгільдзяйства: лодыры былі ў пашане, рабочы калектыў быў развален, грамадская работа адсутнічала. Совецкая гаспадарка прыводзілася ў запусценне. Гэта было ў 1929 годзе. Упраўляўшы соўгасам вораг народа развальваў гаспадарку, цкаваў замаскіраванымі інтрыгамі ўдарнікаў. Быў выпадак, — пасля водпуску Шамко дырэктар распарадзіўся даць ёй на догляд самых дрэнных кароў замест тых, якіх даіла яна да водпуску. Але ў Фёклы залатыя рукі, каровы за кароткі час павялічылі ўдой малака на 400—500 процантаў. Пераканаўшыся ў гэтым асабіста, агіднік дырэктар звольніў Фёклу з работы. З шасцю дзецьмі засталася яна без сродкаў для існавання.

Але вялікая была вера Фёклы Шамко ў сваю правату. Яна стукаецца ва ўсе дзверы, б'ецца за свае права сапраўднай ударніцы, выкрывае падхалімаў і падлюг. Чэсныя людзі, комуністы і актывісты з рабочых прыходзяць ёй на дапамогу. Вораг дырэктар быў выкрыт органамі АДПУ і ізаляван.

З гэтага моманту пачалася сапраўдная паэма радаснай працы — ударнай, прыкладнай працы выдатніцы-даяркі Фёклы Шамко. Ей дапамагаў палітаддзел. Яе дасягненні шырока папулярызаваліся. Была дасягнута сярэдняя *гадовая норма ўдою на карову 2.500* літраў. Ва ўпартай працы была здабыта годнасць стаханаўкі.

Знойдзены свая сістэма, свой метад даення кароў. Яны былі пабудаваны на старанных адносінах да сваёй справы, на любві да работы. Клапатліва, дбайна выдойваць карову, беражліва адносіцца да жывёлы — і ў добрых руках штодзённы ўдой малака няўхільна павялічваецца. Вось прыклад: калі каровы Фёклы Міхайлаўны Шамко пераходзілі ў другія рукі, яны адразу зніжалі ўдой з 25 да 15 літраў; дастаткова было Фёкле Міхайлаўне атрымаць іх назад, як літаральна праз некалькі дзён удой станавіўся высокім.

Шчаслівы чалавек, калі праца спорыцца ў яго руках, дае выдатныя рэзультаты. Хочацца яшчэ больш працаваць, большага дабівацца. 1933—34—35 годы — годы росту ранейшай непісьменнай Фёклы Шамко, годы ператварэння яе з непрыкметнага працаўніка ў знатнага чалавека краіны. У пачатку 1936 года Фёкла Міхайлаўна пастановай ЦВК СССР узнагароджваецца ордэнам «Знак почета».

— Калі я ўбачыла любімага Іосіфа Вісарыёнавіча ў Крэмлі на прыёме, — гаворыць Фёкла Міхайлаўна, — я заплакала ад шчасця і радасці. Я ўспомніла сваё жыццё, горкае і цёмнае да рэволюцыі, і параўнала яго з радасным сённяшнім жыццём. Хваляванне ахапіла мяне пры ўбачанні гэтага простага і вялікага чалавека. Я не магла гаварыць... Цяжка мне выказаць у словах тое шчасце, якое ён даў людзям. Я дала абяцанне Сталіну быць заўсёды першай і лепшай даяркай, і я яго выконваю.

Аднаго разу сабраліся ў Фёклы Міхайлаўны госці, яе браты — рабочыя соўгасаў, ударнікі. Успамінаючы мінулае, старэйшы брат не ўстрымаўся, заплакаў: такі рэзкі кантраст у жыцці сям'і невядомага батрака Міхаіла Жорава, такая розніца паміж праклятым мінулым і шчаслівым сучасным. Шкада, што стары бацька, які не знасіў за жыццё адной пары ботаў, не дажыў да шчаслівых дзён...

Жыццё зараз у Фёклы Міхайлаўны цудоўнае. Дзеці вучацца, растуць. Усяго ўволю. Любімая праца, якая пазышаецца ў прадукцыйнасці, прыносіць велізарнае задаволенне, адчуванне радасці, будавання. Сама Фёкла, не гледзячы на цяжкое пражытае, — бадзёрая, здаровая і шчаслівая. Сваіх кароў, якія даюць выдатныя ўдоі, яна рыхтуе да выстаўкі. Яна ведае, што яна — перадавы ў сваёй галіне чалавек, адна з лепшых людзей сваёй гераічнай радзімы. Яна заяўляе: «Я смелая, упартая, нічога не баюся. Было-б здароўе, а хачу, так хачу працаваць». Вочы яе пры гэтых словах зязюць. У яе маленькай сухенькай фігуры так багата энергіі, сілы. Твар усміхаецца ўпэўнена. Адчуваецца сазнанне вялікай вартасці чалавека Сталінскай эпохі, скромнага, непрыкметнага і разам з тым магутнага.

Фёкла Міхайлаўна вылучана кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР. За такога чалавека выбаршчыкі не задумваючыся, аддадуць 26 чэрвеня 1938 года свае бюлетэні.

ГЛАЗЫРЫН.

Кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР

Ілья Іосіфавіч ЛІПКІН

У габінет урача-акуліста Ільі Іосіфавіча Ліпкіна жвава ўваходзіць жанчына. У руцэ яна трымае нешта ў невялічкай хусцінцы, завязанай вузялком,— жмутак велічынёй у кулак.

— Дзень добры

— Добры дзень. Што скажаце?

Жанчына глядзіць на ўрача вясёлымі прыжмуранымі вачыма. Радасная ўсмешка не сыходзіць з яе твару.

— Дык вось, таварыш доктар, я прынесла...

Яна паказвае хусцінку. Дзівіцца ўрач:

— Што гэта?

— Арэшкі...

— Каму? Мне?

— Ага!

— Падарунак?!

У ўрача ў вачах здзіўленне і збянтэжанасць. На твары строгасць.

— Ды не падарунак, а паказаць хачу, таварыш доктар... Сынок родны... Я... я...

Урач пiскае плячыма.

— Я... — кажа жанчына, — пяць тыдняў ляжала ў вашай больніцы. Я—калгасніца, з Глівенскага сельсовета. Прозвішча маё Павус...

— Павус?! — дзівіцца ўрач. Цяпер на яго твары лагоднасць і радасць. Ён вітаецца з ёю па-прыяцельску за руку.

— Дык гэта вы? А я і не пазнаў. На дваццаць год памаладзелі.

— І ў калгасе тое самае кажуць, міленькі ты мой доктар...

— Сядайце.

Бабуля садзіцца, кладзе хусцінку на стол, падпірае рукой шчаку і гаворыць нараспеў:

— Дзівіцца народ. Чатырнаццаць год была сляпой. Прынесла я, родненькі, арэшкі. Сама выглядзела, назбірала. Пяцьдзесят два арэшкі... Паказаць прынесла... (Развязвае хустачку). Працую цяпер у калгасе. Стаханаўкай хачу стаць. Яшчэ спрытная я. Пакрапчэла. А то гэтулькі год была жывой нябожчыцай. Гляджу на сонейка — і налюбавацца не магу... Калгаснае поле пабачыла: вялізнае такое... Ледзь вокам ахопіш... Дзякую табе ад сябе і ад усіх нашых калгаснікаў, саколік-доктар, за радасць, за шчасцейка, што бачу зямельку родную, сталінскую...

Расчуліўся Ільля Іосіфавіч. Пачынае арэшкі лічыць... Смяецца. На яго твары такая-ж радасць, як і ў калгасніцы Павус.

Некалькі месяцаў назад гэтая-ж самая бабуля ў гэты самы габінет прышла. Не прышла, а яе за руку прывяла малая дзяўчынка. 14 год Павус была сляпою на правае вока, 8 год—на левае. 8 год яна толькі «галасы чула»—радасныя галасы і новыя, раней невядомыя вясёлыя песні...

Ільля Іосіфавіч зрабіў складаную аперацыю катаракты. Такую самую аперацыю ён зрабіў адной барысаўскай грамадзянцы. Роха Блох, 60-гадовая бабуля, была сляпою два годы. І радаваўся тав. Ліпкін разам з ёю, калі яна ўгледзела колер шпалер у сваім пакоі.

Калі ад Барысаўскага раёна была вылучана кандыдатура тав. Ліпкіна ў дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР, старая Роха прышла яго вітаць.

Роха Блох, калі прывялі яе раней сляпую ў больніцу, апавядала доктару:

— Адзін сын загінуў ў акопах у часы імперыялістычнай вайны. Другога забілі белапольскія банды. Дочкі памерлі. І вось я ад гора вочы выплакала...

Цяпер ёй добра. Цяпер яна радасная. Яна не адзінокая; аб ёй клапоціцца совецкая ўлада і ўвесь шчаслівы народ.

Аж двум дзесяткам сляпых удаліў Ілья Іосіфавіч памутнелыя хрусталікі з вачэй. І тыя, хто колькі год былі сляпымі, пабачылі зноў святло. Пасля кожнай такой аперацыі ўрач радуецца не менш за былых сляпых. Радасць і шчасце кожнага з іх — таксама і яго радасць, і яго шчасце.

Дзень у дзень перад маладым совецкім урачом праходзяць хворыя на вочы, якім ён аказвае дапамогу. У нас сляпых не павінна быць. Совецкі народ шчаслівы і не выплаквае вочы.

Да Кастрычніка, з прычыны невуцтва і антыгігіенічных умоў жыцця бядняцкіх мас, па мястэчках і вёсках трахома калечыла вочы сотням і тысячам. Ва ўсёй былой царскай Расіі Беларусь давала самы большы процант трахомных.

У часы Вялікага Кастрычніка совецкі ўрач Ліпкін быў дзесяцігадовым хлапчуком-сіратой. Колькі ён нагледзеўся сляпых жабракоў, што стаялі са сваімі павадырамі ля дзвярэй царквы, сінагогі. Хто на струнах ліры альбо скрыпкі прасіў капеечку, а хто моўчкі выстаўляў руку. Сотнямі праходзілі яны, сляпыя, праз мястэчка Старадуб, дзе нарадзіўся і гадаваўся малы Ілья.

Вандравалі з торбамі, згорбленыя, сівабародыя, калматыя сляпыя жабракі. Праходзілі жабрачкі са страшнымі ямінамі замест вачэй, альбо з чыстымі, нібы зрачымі, вачыма. Хто меў павадыра, а хто сам кійком намацваў сабе дарогу.

Праз скучаныя мястэчкі «рысы аселасці» і праз брудныя вёскі, бядняцкая частка якіх залежала ад панскага маёнтка, нібы ў часы прыгону, ішлі пясчаным гасцінцам ці вузкімі, крывымі, з клейкай гразёю, прасёлачнымі дарогамі сляпыя жабракі.

Гэтае шэсце нагадвала цёмнае жыццё народаў у часы жудаснага царызма.

У той час і большасць зрачых былі як сляпыя. Яны бачылі перад сабою толькі векавечны гнёт і здзек, бачылі толькі нагайку ўрадніка, бліскучыя гузікі царскага чыноўніка і пышны панскі маёнтак, на які гнулі спіну ад цямна да цямна.

Уражлівы хлопчык Ілья, цяперашні любімы ўсім народам Барысаўшчыны совецкі ўрач, марыў тады стаць урачом і вярнуць зрок сляпым. Нямала прайшло год, пакуль гэта затоеная мара спраўдзілася. Спачатку Ліпкін быў слёсарам, пасля набыў сярэднюю адукацыю, а потым вучыўся на ўрача ў Смаленскім медыцынскім інстытуце. Сотні тысяч, мільёны дзяцей, юнакоў і нават старых людзей з рабочых і бядняцка-сялянскіх мас, — хто ад прадзедаў быў як сляпыя, — кінуліся пасля Вялікага Кастрычніка ў адчыненыя дзверы асветы і навукі, нібы з цёмных склепаў у яркае сонечнае святло. Гераічная партыя Леніна—Сталіна і совецкі ўрад адчынілі ўсім светлыя дзверы шчасця, працы і навукі.

Як і многія іншыя, совецкі студэнт Ліпкін меў грамадскую нагрузку—ліквідаваць непісьменнасць, самаахвярна працаваў на розных прадпрыемствах Смаленска выкладчыкам агульнаадукацыйных курсаў, дзе непісьменныя і малапісьменныя рабочыя — падлеткі і дарослыя станавіліся адукаванымі людзьмі.

У 1931 годзе Ліпкін атрымаў годнасць урача. Ён самаахвоць паехаў у раён, дзе больш, чым у якім цэнтральным горадзе, нехапала медыцынскіх работнікаў. Патрэбы працоўнага народа былі для маладога совецкага ўрача даражэй за ўсё, важней за свае асабістыя справы.

З першых дзён урачэбнай дзейнасці Ілья Іосіфавіч акунуўся ў самыя гушчы народных мас, працаваў нястомна і нястомна. Ён сам выйшаў з беднай рабочай сям'і, з гушчы працоўнага народа, і пачаў аддаваць свае веды гэтаму-ж народу. Працы было шмат, совецкі ўрач сіл сваіх не шкадаваў. Амбулаторны прыём на пункце, лекцыі сярод калгаснікаў, агляды дзяцей, праверка санітарнага становішча двароў і кватэр, прапаганда прафілактыкі, арганізацыя ячэек «Чырвонага крыжа», санітарныя дружыны і пасты па калгасах, гурткі для аказання першай дапамогі пры няшчасных выпадках. Усё гэта было праробленa за першы год урачэбнай практыкі ў Старадубшчыне непартыйным большэвіком, совецкім інтэлігентам — Ільёй Іосіфавічам Ліпкіным.

Год службы Ліпкіна ў кадрах Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі ў якасці чырвонаармейца-ўрача можна ахарактарызаваць некалькімі словамі з выступлення тав. Фрыдмана на агульным сходзе выбаршчыкаў — членаў арцелей прамкааперацыі і таварыства сляпых горада Барысава:

«Таварыш Ліпкін з'яўляецца адным з чулых, энергічных таварышоў. Будучы ў радах Чырвонай Арміі, я захварэў. Таварыш Ліпкін не спаў цэлыя ночы, сядзеў каля мяне і лячыў».

З восені 1932 года тав. Ліпкін застаецца працаваць урачом у Барысаве. За гэтыя годы ён зрабіўся папулярным сярод працоўных горада і калгаснікаў усяго раёна. Ён карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод усёй грамадскасці Барысаўшчыны. Ён працуе па-сталінску. У яго няма вузка асабістых спраў. Ён беззаветна аддаўся совецкаму народу. У любы час дня і ночы, не гледзячы ні на якое надвор'е, Ліпкін з'яўляецца на выклік туды, дзе чакаюць яго дапамогі.

Для ліквідацыі рэштак шкодніцтва ворагаў народа ў сістэме аховы здароўя Ілью Іосіфавіча прызначылі ў Райздраўаддзел намеснікам загадчыка. Прыходзіцца працаваць раніцой у больніцы, а дзень да позняй ночы ў Райздраве. За некалькі месяцаў новай работы тав. Ліпкін пабываў ва ўсіх медпунктах, дзе годамі не паказваўся ніхто з работнікаў аддзела аховы здароўя. Яго ведае ўся калгасная маса Барысаўшчыны. Расстаноўка медыцынскіх сіл у раёне — складаная справа. Тав. Ліпкін вельмі і вельмі добра спраўляецца з новымі ўскладзенымі на яго абавязкамі.

На перадвыбарчай нарадзе Барысаўскай выбарчай акругі і на іншых сходах выбаршчыкаў рабочыя і служачыя вельмі горача, з любоўю адзываліся аб тав. Ліпкіну і аднаадушна падтрымлівалі яго кандыдатуру.

У сваім выступленні, расхваляваны і скромны, тав. Ліпкін сказаў:

«Таварышы! Няма слоў, каб выказаць тую радасць, якая сабралася ў маім сэрцы. Аказанае вамі давер'е натхняе мяне працаваць яшчэ лепш. Я вучыўся ў совецкай школе, на сродкі совецкага народа. Памятаючы і ніколі не забываючы гэтага, я стараюся і буду яшчэ лепш старацца добра працаваць, выказваючы гэтым сваю ўдзячнасць дарагому Сталіну, совецкаму ўраду, радзіме. А такіх, як я, выхадцаў з рабочага класа — тысячы. Для ўсіх нас няма лепшага шчасця, як аддаваць свае веды, сваё жыццё народу. Пастараюся, колькі хопіць сіл, апраўдаць ваша давер'е, давер'е ўсіх выбаршчыкаў акругі».

З. БЯДУЛЯ.

„У ТЫЯ ДНІ“ ПЯТРО ГЛЕБКІ

У нас звычайна гавораць, што «У тыя дні» П. Глебкі з'яўляецца не паэмай, а хутчэй паэтычнай хронікай рэвалюцыйных падзей 1914—1917 год. Такое жанравае вызначэнне гэтай рэчы азначае, па-першае, што да гэтага твора нельга прад'яўляць патрабаванняў, якія былі-б законнымі ў адносінах да твораў сюжэтна-эпічнага характару. Скажам, патрабаванне аб'ектывізаваных чалавечых вобразаў. Пятро Глебка не мог паставіць сабе задачай даць у сваёй хроніцы «У тыя дні» ўсебаковы вобраз Уладзіміра Ільіча Леніна, абмяжоўваючы свой паказ правадыра перанясеннем у верш знешніх адзнак ленінскіх паводзін і дзеянняў. Прыгадаем, што нават такі паэт, як Маякоўскі, у сваім паказе Леніна следаваў хутчэй за біяграфічнай канвой ленінскага жыцця, — пашыраючы гэту канву да шырокага ахопу жыцця свету. народа, краіны, — чым за ўнутраным псіхалагічным становішчам ленінскага характару. І ўсё-ж паэма існуе. Значыць, сам па сабе падыход, які заключаецца ў перавазе знешняй біяграфічнай лініі над унутранай сутнасцю вобраза, не вычэрпвае пытання аб каштоўнасці рэчы і не дае яшчэ повадзу для «хранікальнага» яе іменавання ў якасці апраўдваючай яе акалічнасці. Справа ў канкрэтна-паэтычнай рэалізацыі замыслу.

Калі-ж прадоўжваць нашу аналогію з паэмай аб Леніне Маякоўскага, дык можна-б было сказаць, што карэннае адрозненне паэмы Маякоўскага ад хронікі Глебкі заключаецца ў тым, што яе задача паказаць у Леніне гістарычнае развіццё радзімы ажыццёўлена Маякоўскім ў плане публіцыстычна-лірычнай паэзіі, у той час, як Глебка застаўся верным іменна хранікальнаму аваладанню матэрыялам. Знешне, як бачыце, адно і тое-ж, а па сутнасці — найглыбейшая розніца. Калі ў паэме Маякоўскага жыццё і смерць Леніна пададзены ў выглядзе палаcнага, глыбока-асабістага адчування (адсюль і сіла такіх «апорных» месц паэмы, як развітанне з Ільічом), дык у Глебкі, наадварот, жыццё і рэвалюцыйная дзейнасць Ільіча становяцца матэрыялам хутчэй летапіснага выкладання, чым актыўна-творчага перaўтварэння. Адсюль і хранікальнасць паэмы.

Міністры паслалі войска
Душыць абураных сялян...

. . . .

І Ленін кожны дзень нанова
Шукае сцежак і дарог...
І Ленін у Разліве піша план —
Пралог рэспублікі соцыялізма.
Першы залп за Няву
Пасылае «Аўрора»,
Дый не хоча здавацца
Зімовы палац.

Паэзія, зведзеная да ўзроўню пераказа падзей, з'яў, фактаў, незвычайна багата губляе ў сіле свайго ўздзейнічання. Калі гаварыць аб лепшых месцах «хронікі» Глебкі, прыдзецца ўстанавіць, што імі з'яўляюцца тыя, якія менш за ўсё апраўдваюць «хранікальнае» азначэнне. Скажам, месца, дзе Глебка апавядае аб Леніне ў эміграцыі, калі яму, адчужанаму і разлучанаму са сваёй любімай радзімай, у сне прыходзяць яе снягі і прасторы. Вельмі добрае месца.

Радзіма!
Доўгімі начамі
ты снілася ў кароткіх снах
з тваімі ціхімі палямі,
з маркотным шумам па лясах.

Альбо тыя месцы паэмы, якія прысвечаны паказу народных бедстваў, прынесеных імперыялістычнай вайной. У іх ёсць сапраўдны чалавечы боль за ашуканых салдатаў, якім у рэдкія мінуты франтавога зацішша ўспамінаецца «родны дом».

Якая ціш ў іхнай хаце!
Якая скруха і туга!
Чыясьці згорбленая маці
Збірае шчаўе на лугах.
Чыясьці жонка-парабчанка,
Чужое поле аручы,
Спявае сыну калыханку
І горка плача пяючы.

Радкі добрыя тым, што ў іх ёсць пэўная творчая думка паэта і гэта думка пераважае над схемай агульнага апавядання. Да таго-ж паэтычна гэтыя радкі арганізаваны так, што яны становяцца па-сапраўднаму дзейснымі і даходчывымі, не так, як у вышэйпрыведзеных вершах («Першы залп за Няву пасылала «Аўрора», де не хоча здавацца Зімовы палац»), у якіх страфа «мантыравалася» ад радка да радка. Тут, у гэтых радках аб парабчанцы, вялікая эканомія верша дасягаецца шляхам натуральнага і безупыннага нарастання інтанацыі, якое ператварае гэту разрозненую страфу ў скупы і важкі вершавы перыяд.

Наогул трэба сказаць, што найбольш моцнымі месцамі глебкавай паэмы з'яўляюцца іменна тыя, у якіх паказана і перададзена народнае гора, народнае хваляванне. Так, напрыклад, аб тысячах забітых рускіх салдатаў паэт сказаў скупа і выразна, з сапраўдным адчуваннем так званай «шчытнасці» і «рэчаваcці» верша:

На мармуровых плітах высеч
Патрэбна-б золата імён:
Іх шэсцьдзесят суровых тысяч
Загінула за дзесяць дзён.

Глебка ўдала падкрэсліў у сваёй паэме думку аб арганічным і непарыўным адзінстве Леніна, комуністычнай партыі з усім народам. Уласна кажучы, гэта думка з'яўляецца асноўнай у паэме. І калі мы гаворым аб недастаткова праведзеным ператварэнні гэтай агульна-палітычнай думкі ў думку ўнутрана-паэтычную, дык мы ў першую чаргу маем на ўвазе іменна ўстаноўку паэта на хранікальны пераказ падзей замест творчага пранікнення ў тэму.

Нам здаецца, што, адмовіўшыся ад спакусы даць у вершах «шырокае палатно», Глебка павінен быў будаваць сваю паэму па канструкцыйных прынцыпах паэм Маякоўскага. А гэта, у першую чаргу, азначае, што Глебка павінен быў ярчэй выявіць лірычную тэму паэмы.

Рэалізм паэм Маякоўскага дасягаўся шляхам злучэння эпічна-апісальнай лініі (у «Хараша» — бегства Врангеля, узяцце Зімняга) з усёахапляючай тэмай паэта-байца. У працэсе свайго творчага росквіту Маякоўскі ішоў ад «Леніна» да «Хараша» — ад больш простых і адналінейных прынцыпаў пабудовы паэмы да больш складаных і багатых. У «Хараша» аказалася ажыццёўленай устаноўка Маякоўскага на лірычнае аваладанне матэрыялам — тое, што ім самім названа прынцыпам «перабіўкі матэрыялаў», г. зн. перамежаваннем падзей гістарычнага значэння з фактамі і падзеямі асабістага парадку. Успомнім, што паэтычны матыў савецкага патрыятызма ў «Хараша» вырастае з асабіста-любоўнай тэмы паэта. Самая шырокая соцыяльна-грамадская тэма паэта становіцца законнай у «парадку асабістай яго асацыяцыі».. Мы гаворым аб усім гэтым нездарма ў сувязі з «хронікай» П. Глебкі. Яна дае даволі повадаў для пастаноўкі ўсіх гэтых пытанняў, хоць і з адмоўным знакам пры гэтым.

Другое пытанне, якое нам хацелася-б узняць, зноў-такі ў сувязі з паэмамі Маякоўскага, — гэта пытанне аб якасці верша Глебкі. Адзначым, што пры ўсёй неадпаведнасці агульных установак, у «хроніцы» Глебкі ўсё-ж ёсць асобныя мясціны, радкі, строфы, якія вельмі нагадваюць аналагічныя мясціны з паэмы «Хараша», аж да рыфм, скажам:

Грымяць суровай **эпапеяй**
«Окопной праўды» тыр...жы...
Не дарма медзь сваіх **капеек**,
Свае медалі і крыжы... і г. д.

А ў Маякоўскага:

Работа трудна,
работа томит.
За нее
никаких копеек.
Но мы
работаем,
будто мы
делаем
величайшую эпопею.

«Эпапея»—«капеек» — не выпадковая рыфмоўка. У ёй ёсць тая заканамернасць, якая ператварае падобнае гучанне ў адзін з узмацніцеляў сэнсавага руху верша. «Эпапея» ў сэнсе велічнасці адбываючыхся рэвалюцыйных падзей адгукаецца ў рыфмуючымся радку «штодзённай» сваёй матывіроўкай у выглядзе салдацкіх грошай, звычайнасці, **капеек**. Гэта і ёсць, так званы, сэнсавы верш Маякоўскага. Тэма, як бачыце, не вісне ў паветры. У яе ёсць ключ, а ключ — у любым слове, у рыфме.

Значна горш напісаны тыя мясціны паэмы, у якіх тэма паэта іменна высоўваецца з верша. Напрыклад:

Абы жыццё рабочых і сялян
Навек збыло ярмо капіталізма.
І Ленін у Разліве піша план —
Пралог рэспублікі соцыялізма.

Гэта вельмі неахайны радок. Таксама залішне публіцыстычна гучаць і наступныя радкі:

Мір і братанне!..
Улада — советам,
Шахты — рабочым,
Сялянам — зямля,
Зброя — народу...

Сляды паспешнасці і неахайных адносін да радка далі сябе адчуць на многіх радках «хронікі» Глебкі. Асабліва на тых, дзе сказалася квяцістая фраза і неўласцівая нашаму ўяўленню аб Ільічу абстрактная гіпербалічнасць:

А ён, вялікі і магутны
І радасны, як светлы дзень...

Значна лепшыя тыя мясціны «хронікі», у якіх самой накіраванасцю і ходам радка ўлоўлены некаторыя адрозніваючыя рысы ленінскага характару (рэзкасць, імклівасць, рашучасць):

Над крыклівай помпаю
Трагікаў і эпікаў
Выбухае бомбаю
Ленінская рэпліка.

Тут і неакрэсленасць гэтых «трагікаў і эпікаў» у большай меры адпавядае неакрэсленасці тых «здраднікаў з кадэтамі», чый «салодкі і прагненькі» свіст сунімаецца ленінскай упэўненасцю ў перамозе рабочага класа і яго партыі. Што-ж датычыць такіх строф, як:

Маладыя вятры адшумелі,
Ціха плешчыцца сонны прыбой.
Чалавек у армейскай шынелі
Задумёна ідзе над Нявой, —

прыдзецца ўказаць, што іх своеасаблівая паэтычнасць вынікае не ад самой тэмы і не ад характару падзей і людзей, якіх бярэцца апісваць Глебка, а хутчэй ад устанавіўшагася ў паэтычнай традыцыі асобага спосабу перадаваць «задушэўнасць» і «лірычнасць». «Паэтычнасць» страфы ідзе не ад жывой рэчаіснасці, а ад раней адбыўшагася паэтычнага факта.

Такім чынам, паэма «У тыя дні» П. Глебкі не можа быць ацэнена як перамога паэта. У ёй вельмі моцна сказалася непрыемлемая для нас устаноўка на хранікальны пераказ тэмы замест актыўнага аваладання ёю і, па-другое, недастаткова ўважлівыя адносіны да пытанняў паэтычнай маляўнічасці.

Н. К.

„НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ“

(КНІЖКА АПАВЯДАННЯЎ УСЕВАЛАДА КРАЎЧАНКІ).

Апавяданні Усевалада Краўчанкі, што друкаваліся ў 1936 і 1937 годзе ў журнале «Полымя рэволюцыі», былі прыхільна сустрэты чытачом і крытыкай. Малады аўтар прыцягнуў да сябе ўвагу свежасцю тэматыкі, арыгінальным мастацкім вырашэннем яе. Сабраныя разам, гэтыя апавяданні склалі цікавы зборнік.

У кніжцы змешчана пяць апавяданняў. Найбольш удалым сярод іх трэба лічыць самае кароткае (да яго, як кажуць, нічога не дадасі, але і не адымеш) — «Дзедаў прынцып». Любоўна, з цёплым гумарам, паказваецца ў ім Краўчанкам буркатлівы дзед Мацей, добраахвотны «рэвізор», балельшчык за парадак,—праобраз калгаснага інспектара па якасці. Краўчанка дае нібы мімаходзь дэталі: «Ідзе, скажам, Мацей па вуліцы, убачыць, што прызьба ля хаты ў каго-небудзь не падсыпана, лаўкі, каб пасядзець можна было, няма, — адразу закрычыць: — Даніла! не лянуйся, прызьбу падсып, лавачку змайструй...»

Калі ля калгаса сеў самалёт, якога дзед ніколі зблізу не бачыў, — «Міцька паспеў ужо чатыры платы пераскочыць — так ён спяшаўся нацянькі да ялавіны, каб самалёт убачыць. Мацей-жа пастаяў у варотах, пагупаў тудысюды, граблі ўзяў, падгроб каласкі на таку ў адну кучу».

Скупыя, але надзвычай выразныя, гэтыя дэталі яскрава акрэслілі вобраз дзеда Мацея. Вобраз ажыў, асвятліў усё апавяданне. І таму лагічнай, пераканаўчай вышла канцоўка: калі дзед вылазіць з самалёта пасля «паветранага хрышчэння», ён не зважае на натоўп, што напружана чакае яго ўражанняў, і шукае вачыма пастушка Сярожу, кінутыя якім каровы «поўгектара грэчкі калгаснай зглумілі». — З самалёта мне ўсё відно было, — кажа дзед-«рэвізор».

У апавяданні «Прыкрае здарэнне» пераканаўча паказаны гордасць калгасніка Тамаша за заможнае жыццё, натуральнае яго жаданне пахваліцца сваім дабрабытам перад братам—аднаасобнікам Цімохам, з якім Тамаш не ў ладах. Калі настае самая ўрачыстая хвіліна—дэманстрацыя перад братам-хутаранінам радыёпрыёмніка, высвятляецца, што прыёмнік сапсаваўся... Краўчанка хвалюючa перадае перажыванні Тамаша. Калі Цімох ад'ехаў,—знайшлася прычына папсавання прыёмніка; Тамаш кінуўся быў вяртаць брата, але спыніўся: перамагае гордасць новага чалавека, перамагае пачуццё агіды да Цімоха, які «прыкідваецца, што не бачыць нашага светлага жыцця», і якога «бочкі з жытам, што стаяць у каморы, увялі, зайздросніка, у злосць».

Гэтую гордасць новага, калгаснага селяніна паказвае Краўчанка і ў апавяданні «Радасць». Сюжэт апавядання нескладаны: цётка Хрысціна атрымлівае ад сына пісьмо, з якога даведваецца, што ён—сын яе—ужо лётчык і прыляціць на дзянёк у родную вёску. Радасныя перажыванні маці, агульную ўвагу і ўдзел у гэтай радасці ўсіх калгаснікаў, аўтар удала кантрастуе з паказам жудаснага мінулага сялянскага жыцця.

У гэтым кароткім апавяданні Краўчанка выводзіць рад персанажаў, надзеленых трапнымі індывідуальнымі рысамі. Не пашанцавала аўтару толькі з паштальёнам Грышкам, вясёлым юнаком-ласуном. Захапіўшыся гэтай, апошняй, рысай Грышкі, Краўчанка, вычарпаўшы асноўную тэму апавядання, стварае штучную дадатковую канцоўку, у якой прымушае сімпатычнага чытачу юнака прынесці цётцы Хрысціне фальшывае пісьмо, каб трапіць на чарговы ласунак. Канцоўка гэта гучыць фельетонна, выклікае толькі прыкрасць.

Не заўсёды ўдаецца Краўчанку паказ унутраных перажыванняў яго персанажаў. Так, у апавяданні «На крутым павароце» аўтар не здолеў пераканаўча паказаць паварот цыгана Франэка і яго табару да аселага, калгаснага жыцця. Аб'ектыўна выйшла так, што зрабіць круты паварот у жыцці Франэка прымусіла, хутчэй, не ўздзеянне сына-чырвонаармейца, а жывёльнае пачуццё страху цыгана-канакрада.

Складанасць пачуццяў, калі «мёртвае хапае за жывое», яшчэ менш ўдала перададзена ўвогуле не дрэнным апавяданні «Крывая сцежка». Краўчанка паказвае тут перадавога трактарыста, які, аднак, у пытаннях кахання—чалавек з «радзімымі плямамі» «капіталістычнага свінства».

«Гэта быў рамантычны юнак». Такім сказам пачынае аўтар сваё апавяданне. Аднак, гэта якасць трактарыста Сяргея не разгорнута, ходам падзей не апраўдана. Перад чытачом, наадварот, устае грубы рэаліст з выразнымі натуралістычна-жывёльнымі прагненнямі. У той-жа час аўтар толькі мімаходзь паказвае ўнутраны змест сяргеевай каханкі Ніны. Яна — жыццёвы, праўдзівы вобраз. Аднак, заклапочаны шчаслівым вырашэннем лёсу Сяргея, аўтар зніжае сілу вобраза Ніны, прымушаючы яе ўміг, без ніякіх перажыванняў, дараваць Сяргею, які раней, ашукаўшы, пакінуў яе з маленькім дзіцем.

Сабраныя разам, апавяданні Краўчанкі выпукла акрэсліваюць не толькі дадатныя якасці маладога пісьменніка. Яны гэтак-жа выразна выяўляюць і недахопы, якія паказваюць, куды трэба накіраваць найбольшую ўвагу ў яго далейшай творчай працы. Гэта—перш за ўсё—недастатковая ўвага да мастацкага слова, да вобразнасці яго, да лакальнай, так сказаць, адпаведнасці вобраза матэрыялу. Прыкра бачыць такія няўдалыя вобразы, як **«радасць, лёгкая, як павуцінне** «бабінага лета», увайшла ў яе», «сядзеў, нібы **высечаны з каменя...** з застыўшаю нежывою **маскаю** твару. Нярэдка сустракаюцца ў Краўчанкі і такія няўдалыя, сухія альбо заштампаваныя сказы, як: «надзвычай смачныя варэнікі»; «Грышка парашыў дзейнічаць больш актыўна», «Грышка абярнуўся» (опрокинулся?); «а тая стаяла, узрушаная праяўленнем такога шчырага ўдзелу»; «Алеку (непісьменнаму цыгану) хацелася даведацца, ці догмаю з'яўляецца жыццё, устаноўленае дзядамі»; «дні пабеглі новыя, цікавыя, як у калейдаскопе» (для таго-ж Алека); «лісток быў як быццам сімвалам гнілой, няўтульнай восені» (для непісьменнага Франэка); «ажываў лес, набрынялі почкі на яго бязлістых чорных галінах» (галіны леса ці дрэў?); «па яе дзявочай шчацэ прабегла першая крыштальная сляза»; «у адносінах да яго сяброў лягла паляна холаду»; «ён знаходзіў хвіліну, каб пагутарыць пра тое-сёе з люлькай у зубах на прызьбе з суседзямі» (люлька сядзела з суседзямі і з ёй гутарылі?).

«На крутым павароце» — другі зборнік Усевалада Краўчанкі. Ён сведчыць пра бясспрэчны творчы рост маладога пісьменніка і пра вялікія магчымасці, якія адкрые перад ім глыбокая творчая вучоба.

Хв. ШЫНКЛЕР.

Праф. М. ДАБРЫНІН

В. Г. БЕЛІНСКІ І РУСКІ НАРОД

«Памру на журнале і ў труну скажу пакласці пад галаву кніжку «Отечественных записок». Я літаратар— гавару гэта з хваравітым і разам з радасным і гордым перакананнем. Літаратуры расійскай маё жыццё і мая кроў». В. Белінскі.

Эвалюцыя філасофскіх, эстэтычных і крытычных поглядаў В. Г. Белінскага была абумоўлена развіццём грамадскіх адносін у Расіі 40-х год і той роллю, якую Расія адыгрывала ў міжнароднай рэвалюцыйнай барацьбе. Трэба рашуча адхіліць тую мысль, што развіццё Белінскага было адлюстраваннем філасофскай эвалюцыі на Захадзе. Праўда, на першы погляд цяжка растлумачыць эвалюцыю Белінскага (ад Шэлінга да Фіхтэ, ад Фіхтэ да кансерватыўнага гегельянства, далей да Гегеля-дыялектыка і, нарэшце, да Фейербаха) класавай барацьбой і развіццём грамадскіх адносін у Расіі. Аднак, дыялектычнае прымяненне ленінскай тэорыі адлюстравання прымушае мысліць іменна так. На самой справе, Ленін падкрэсліваў, што Белінскі адлюстроўвае настроі прыгонных сялян, высмейваючы «Московские Ведомости», якія даводзілі, што руская дэмакратыя, пачынаючы хоць-бы з Белінскага, ні ў якім разе не выражае інтарэсаў самых шырокіх мас насельніцтва ў барацьбе за элементарнейшыя правы народа, якія парушаюцца прыгонніцкімі ўстановамі, выражае толькі «інтэлігенцкія настроі». Ленін пісаў: «ці, можа быць, па думцы нашых разумных і адукаваных аўтароў, настрой Белінскага ў пісьме да Гогаля не залежаў ад настрою прыгонных сялян? Гісторыя нашай публіцыстыкі не залежала ад абурэння народных мас рэшткамі прыгонніцкага ўціску?» (Том XIV, стар. 219).

Пісьмо Белінскага да Гогаля і з'яўляецца як раз тым выдатным дакументам, які дае вычарпальную характарыстыку яго адносін да рускага народа. Значэнне гэтага пісьма было ацэнена Леніным так: «Гэта пісьмо, якое падводзіла вынік літаратурнай дзейнасці Белінскага, было адным з лепшых твораў безцэнзурнага дэмакратычнага друку, што захавалі велізарнае жывое значэнне і да гэтага часу». (Том XVII, стар. 341).

Ясная справа, што пісьмо, напісанае ў 1847 годзе, было вынікам эвалюцыі поглядаў Белінскага, і аналіз пісьма паказвае, чым стаў Белінскі напярэдадні сваёй смерці. К гэтаму часу ў яго сфармуліраваліся патрабаванні адносна Расіі ў наступным выглядзе: «Расія бачыць сваё выратаванне не ў містыцызме, не ў аскетызме, не ў піэтызме, а ў поспехах цывілізацыі, асветы, гуманнасці. Ей патрэбны не пропаведзі (досыць яна чула іх!), не малітвы (досыць яна цвярдзіла іх!), а прабуджэн не ў народзе пачуцця чалавечай годнасці, гэтулькі стагоддзяў страчанага ў брудзе і смецці, — правы і законы, суадпаведныя не з вучэннем царквы, а са здаровым сэнсам і справядлівасцю, і строгае па магчымасці іх выкананне. А замест гэтага яна прадстаўляе сабою жахлівае відовішча краіны, дзе людзі гандлююць людзьмі, не маючы на гэта і таго апраўдання, якім хітра карыстаюцца амерыканскія плантатары, сцвярджаючы, што негр не чалавек; краіны, дзе людзі самі сябе называюць не імёнамі, а мянушкамі: Ванькамі, Васькамі, Стешкамі, Палашкамі; краіны, дзе, нарэшце, няма не толькі ніякіх гарантый для асобы, чэсці і ўласнасці, але няма нават і паліцэйскага парадку, а ёсць толькі велізарныя карпарацыі розных службовых зладзеяў і рабаўнікоў! Самыя жывыя, сучасныя нацыянальныя пытанні ў Расіі цяпер: знішчэнне прыгоннага права, адмена цялеснага пакарання, увядзенне па магчымасці строгага выканання хоць тых законаў, якія ўжо ёсць. Гэта адчувае нават сам урад (які добра ведае, што робяць памешчыкі з сваімі сялянамі, і колькі апошнія штогод рэжуць першых), што даводзіцца яго баязлівымі і бясплоднымі поўмерамі на карысць белых неграў і камічным замяненнем аднахвостай пугі трохвостым бізуном».

Наўрад ці можна сумнявацца ў тым, што Белінскі выступае тут перад намі як рэвалюцыянер-дэмакрат, які адлюстроўвае настроі і спадзяванні шырокіх народных мас прыгоннага сялянства. Ён такім чынам становіцца папярэднікам рэвалюцыйнай сялянскай дэмакратыі 60-х год, папярэднікам Чэрнышэўскага і Дабралюбава. На гэта яшчэ ўказваў В. І. Ленін, калі пісаў: «Папярэднікам поўнага выцяснення двараан разначынцамі ў нашым вызваленчым руху быў яшчэ пры прыгонным праве В. Г. Белінскі». (Том XVII, стар. 341).

Так, гэта быў папярэднік і сапраўдны настаўнік рэвалюцыйнай дэмакратыі 60-х год, якая выхавалася на яго працах і прадоўжвала справу барацьбы, пачатую ім.

Удумваючыся ў крытычную дзейнасць Белінскага, мы разумеем не толькі яе рэвалюцыйны сэнс, але і тое, чаму гэты баец па натуры займаецца іменна літаратурай, а не іншай формай палітычнай дзейнасці. Рабілася гэта таму, што літаратура была адзінай галіной, дзе было магчыма яшчэ жыццё і рух наперад. Сам В. Г. Белінскі добра разумеў гэту рэвалюцыйную вызваленчую ролю нашай літаратуры, калі пісаў: «Вы, наколькі я бачу, не зусім добра разумееце рускую публіку. Яе характар вызначаецца становішчам рускага грамадства, у якім кіпяць і ірвуцца наповерх свежыя сілы, але, сціснутыя цяжкім гнётам, не знаходзячым выйсця, наводзяць толькі смутак, тугу, апатыю. **Толькі ў адной літаратуры, нягледзячы на татарскую цэнзуру ёсць, яшчэ жыццё і рух наперад».** (Падкрэслена мною — **М. Д.**).

Эпоха была рэакцыйная і Белінскі, па яго ўласных словах, народжаны, каб выць шакалам, павінен быў круціць хвастом па-лісічаму. Заключаны ў сферу чыста літаратурнай дзейнасці, ён сумаваў і ірваўся наперад, ён хацеў тварыць жыццё, а не проста разважаць аб ім. Але рабіць было нечага і літаратурная дзейнасць была адзінай формай барацьбы. «І публіка тут управах: яна бачыць у рускіх пісьменніках сваіх адзіных правадыроў, абаронцаў і збавіцеляў ад рускага самадзяржаўя, праваслаўя і народнасці, і таму, заўсёды гатовая прабачыць пісьменніку дрэнную кнігу, ніколі не прабачыць яму злашкоднай кнігі. Гэта паказвае, колькі ляжыць у нашым грамадстве, хоць яшчэ ў зародку, свежага, здаровага чуцця, і гэта-ж паказвае, што ў яго ёсць будучнасць. Калі вы любіце Расію, парадуйцеся разам са мною падзенню вашай кнігі!..»

Так, руская літаратура была магутнай і, можна сказаць, адзінай сілай, што вядзе барацьбу за народ, і рускія літаратары выконвалі ганаровую ролю змагароў за яго вызваленне.

З усяго сказанага лёгка заключыць аб тым, якое велізарнае значэнне для Белінскага мела пытанне аб народнасці літаратуры. Яна павінна быць люстрам рускага грамадства і рупарам яго перадавых ідэй. На тэму аб народнасці Белінскі разважае ўжо даволі рана. Яго артыкулы: «Руская народная паэзія» і «Агульны погляд на народную паэзію і яе значэнне» адносяцца да 1841 года. Тут Белінскі разважае аб народнасці яшчэ не так рэволюцыйна, як пазней.

Эвалюцыя ў галіне філасофіі і эстэтыкі патрабавала паглыблення і пашырэння яго поглядаў у галіне паасобных праблем літаратуры. Пераход да матэрыялізма Фейербаха даваў новую базу для разумення народнасці ў літаратуры. Абарона натуральнай школы і патрабаванні праўды жыцця абумоўлівалі зліццё пытання аб рэалізме з пытаннем аб рэволюцыі. Пытанне-ж аб рэволюцыі было пытаннем перш за ўсё народнага вызвалення, пытаннем аб соцыялізме.

Такая логіка ў асноўных рысах эвалюцыі Белінскага. Мы бачым, што для яго праблема народнасці зліваецца з пытаннем аб соцыялізме. Для разумення соцыялізма Белінскага вельмі важны артыкул Леніна аб Герцэне, бо апошні ішоў з няўрымслівым Вісарыёнам рука ў руку. Мы не маем магчымасці разгарнуць гэта пытанне на ўсю шырыню і толькі адзначым некаторыя істотныя моманты, неабходныя для якаснага разумення народнасці. Народнасць Белінскага ў літаратуры — рэволюцыйна - дэмакратычнага талкавання. Яна — не адцягненая і абстрактная любоў да народа, як у славянафілаў, не лакейска-ўгодніцкая, прыніжаючая і скажаючая народ, як у тэарэтыкаў афіцыяльнай народнасці, а рэволюцыйна - дэмакратычная, стала-быць з пэўнай праграмай барацьбы за народ, за рэволюцыю. Яна прадыктавана палкай любоўю змагара за чалавека і перш за ўсё за чалавека-мужыка, за вялікі рускі народ. Варта толькі ўспомніць узрушаючыя радкі вядомага пісьма да Боткіна ад 1841 года, каб пераканацца ў гэтым. Вось гэтыя палкія словы геніяльнага крытыка, якія апякаюць нас і цяпер, амаль праз 100 год:

«Соцыяльнасць, соцыяльнасць — ці смерць! Вось дэвіз мой. Што мне ў тым, што жыве агульнае, калі пакутуе асоба? Што мне ў тым, што геній на зямлі жыве ў небе, калі натоўп валяецца ў брудзе? Што мне ў тым, што я разумею ідэю, што мне адчынен свет ідэі ў рэлігіі, у гісторыі, калі я не магу гэтым дзяліцца з усімі, хто павінен быць маімі братамі па чалавецтву... Што мне ў тым, што для абраннікаў ёсць блажэнства, калі большая частка не падазрае яго магчымасці? Прэч-жа ад мяне блажэнства, калі яно магчыма мне аднаму з тысяч! Не хачу я яго, калі яно ў мяне не агульнае з меншымі братамі маімі! Сэрца маё абліваецца крывёю і сударгава садрагаецца пры позірку на натоўп і яго прадстаўнікоў. Гора, цяжкае гора апаноўвае мною пры ўбачанні і босаногіх хлапчукоў, што гуляюць на вуліцы ў бабкі, і абшарпаных жабракоў, і п'янага рамізніка, і ідучага з разводу салдата, і бягучага з партфелем падпахай чыноўніка, і задаволенага сабою афіцэра, і ганарлівага вяльможы. Падаўшы грош салдату, я ледзь не плачу, падаўшы грош жабрачцы, я ўцякаю ад яе, быццам зрабіўшы благую справу, і нібы не жадаючы слухаць шолаху ўласных крокаў сваіх. І гэта жыццё: сядзець на вуліцы ў лахманах, з ідыёцкім выразам на твары, назбіраць удзень некалькі грошаў, а ўвечары праліць іх у шынку — і людзі гэта бачаць і нікому да гэтага няма справы!..»


Абвяшчаючы далей сваім богам адмаўленне, Белінскі марыць пра той час, калі не будзе ні багатых, ні бедных, ні цароў, ні падданых, а ўсе людзі будуць братамі, і заканчвае:

«І гэта адбудзецца праз **соцыяльнасць.** І таму няма нічога вышэй і благародней, як спрыяць яе развіццю і ходу. Але смешна і думаць, гэта можа стацца само сабою, часам, без гвалтоўных пераваротаў, без крыві. Ды і што кроў тысяч у параўнанні са знявагай і пакутамі мільёнаў...»

Якой любоўю да чалавека, да чалавецтва гучаць гэтыя словы, якой палкай верай прасякнуты яны ў неабходнасць рэволюцыі, соцыялізма, вызвалення мільёнаў ад знявагі і пакут. Гэта сапраўды заклік да паўстання, адлюстровак пратэсту шырокіх народных мас.

Лёгка бачыць, што мыслі Белінскага не памерлі, яны далі багаты плён, з'явіўшыся асновай для рэволюцыйных дэмакратаў 60-х год; яны ўвайшлі ў нашу спадчыну як надзвычайная і найкаштоўнейшая скарбніца, якая сведчыць аб вялікай сіле чалавека і грамадзяніна Вісарыёна Грыгор'евіча Белінскага. Толькі ў вялікага народа могуць нараджацца такія людзі, толькі ён—неўміручы народ мог абуджаць такую палкую бескарыслівую любоў і адданасць справе народа, якой вызначаўся В. Г. Белінскі.

Природа-мать! Когда б таких людей
Ты иногда не посылала миру
Заглохла б нива жизни.



7 чэрвеня споўнілася 90 год з дня смерці выдатнага рускага крытыка В. Г. Белінскага.

НА ЗДЫМКУ: В. Г. Белінскі (1811 — 1848 г.). Гіпсавы бюст А. С. Казлова.

МАЯ РАБОТА НАД ВОБРАЗАМ Т. ГАЛОТЫ

ІВАН АГЕЙЧЭНКАЎ

Артыст Маскоўскага тэатра Рэволюцыі

Набліжалася 20-я гадавіна Кастрычніка — выключна адказная дата для любога совецкага тэатра і асабліва для нас — тэатра Рэволюцыі.

Дастойна сустрэць вялікае свята можна было толькі п'есай, якая шырока раскрывае героіку пролетарскай рэволюцыі, ролю большэвіцкай партыі ў рэволюцыі і яе геніяльнага праваднра—Владзіміра Ільіча Леніна. Такой п'есай, прынятай тэатрам у пачатку ліпеня мінулага года, з'явілася «Праўда» — твор совецкага драматурга, дэпутата Вярхоўнага Совета СССР А. Карнейчука.

Вобраз Тараса Галоты, украінскага селяніна-бедняка, які шукае праўды і якую ён знаходзіць толькі ў большэвікоў, спадабаўся мне адразу яшчэ пры чытцы п'есы. Я быў глыбока шчаслівы, калі роля Тараса была даручана мне, але калі прайшоў першы парыў радасці, мне прышлося вельмі і вельмі прызадумацца.

Усяго два з паловай месяцы для падрыхтоўкі адной з цэнтральных ролей п'есы — гэта быў сапраўды кароткі тэрмін.

Натуральна, што перш за ўсё я звярнуўся да свайго акторскага багажу. За 15 год мною было сыграна звыш 45 ролей і толькі адна з іх была роля селяніна-сезонніка на будоўлі, — роля, якая не мела нічога агульнага з роляю Тараса. Не, акторскі багаж у гэтым выпадку не мог саслужыць мне сваёй службы. Паўстала пытанне, дзе шукаць, дзе знаходзіць тыповыя рысы Тараса?

Зноў перачытаў я п'есу. Вось першая сустрэча Тараса з Кузьмом. На невялікім палустанку ён апавядае большэвіку Рыжову, што ідзе ў Сібір, дзе людзям напэўна лепш жывецца, таму што калі яны адыходзяць туды — назад не вяртаюцца. Чымсьці знаёмым здалася мне гэта размова. І раптам я ўспомніў: — так, гэта-ж самае гаварылася ў нашай вёсцы, у сям'і майго бацькі, у сям'і дзядзькі, — такіх-жа беднякоў, як Тарас. У гэту-ж Сібір збіраўся ехаць бацька, перасяліўся дзядзька, выехала яшчэ шэсць двароў з нашай вёскі ў Смаленскай губерні. Выязджалі ад голаду, ад безвыходнай мужыцкай нястачы. Гэта было ў 1906 годзе. І хоць я тады быў яшчэ зусім невялікім хлапчуком, але на ўсё жыццё ўрэзаліся мне ў памяць цяжкія сялянскія размовы аб Сібіры, зборы ў дарогу, горкія слёзы развітання.

Асабістыя ўспаміны — вось першая, выключна багатая, крыніца, якой я карыстаўся, працуючы над вобразам. Гэтыя ўспаміны аб жыцці сялян неабходна было асвяжыць новымі назіраннямі. У часе свайго адпачынку ў Алексіна (пад Масквой) я сустракаўся з калгаснікамі, прыглядаўся да іх хады, жэстаў, уважліва прыслухоўваўся да іх мовы. Гэта была другая крыніца, якой я карыстаўся для стварэння вобраза Тараса Галоты.

Трэцяй крыніцай былі музеі — Рэволюцыі і імя Леніна, першы том «Гісторыі грамадзянскай вайны», рад іншых літаратурных матэрыялаў і сустрэчы з непасрэднымі ўдзельнікамі Кастрычніцкай рэволюцыі. У музеі імя Леніна я асабліва доўга стаяў перад зарысоўкай сустрэчы Леніна з сялянскімі халакамі. Асабіста мне ніколі ў жыцці не прышлося пабачыць Ільіча. Я не ўяўляў сабе, як мог просты селянін-бядняк гаварыць з вялікім праваднром. Гэта зарысоўка дапамагла мне наглядна зразумець усю веліч ленінскай прастаты.

Ператварыць вобраз Тараса Галоты ў жыццё мне дапамагла сцэна канфлікту Кузьмы з яго братам Цімафеем. Іменна ў гэтай сцэне, дзе я — Тарас Галота і Кузьма Рыжоў выкрываем палахлівасць і прадажнасць Цімафея, мне ўдалося знайсці ўнутраны рытм ролі. Лінія паводзін Тараса Галоты, сялянскага праўдашукальніка, які шукае гэту праўду і ў асабістым і ў агульным сялянскім жыцці, стала мне зразумелаю і блізкаю.

Цяпер пачаліся пошукі характэрнасці, вонкавай тыповасці. Я, бадай, не памылюся, калі скажу, што першы выхад актора на сцэну амаль заўсёды вызначае яго далейшыя паводзіны. Як-жа павінен быў з'явіцца перад гледачом Тарас, які прышоў на палустанак пасля пройдзеных ім 500 клм.? Я адчуваў, што ў яго павінна быць цяжкая сялянская нага, прывычаеная да шматгадовай хады за плугам, за баранай, стомленая тысячамі кілометраў, пройдзеных на фронце. Ужо вышэй я гаварыў, што сачыў за хадой сялян,— яна сапраўды была такой. Бачанае ў жыцці я перанёс на сцэну.

Пры першым сваім паяўленні Галота спявае смутную сялянскую песню. Калі рыхтаваўся спектакль, дырыжор тэатра прынёс мне песню, якая, калі-б яе спяваць так, як яна была напісана, склала-б нядрэнны канцэртны нумар, але якая ніяк не вязалася з вобразам Тараса. Мне трэба было яе «амазоліць», зрабіць закарузлай, трэба было, каб скрозь песню гледач адчуў шырокі украінскі стэп, вялікі шлях, пакінуты Тарасам ззаду. Я ўспомніў, як спяваў мой бацька, іншыя сяляне. Нот яны не выводзілі, спявалі як прыдзецца, выказваючы ў песні сваё сапраўднае становішча.

Калі мы рэпетыравалі спектакль, рэжысура не раз указвала мне, каб я гаварыў сваім прыродным голасам. Я не мог з гэтым пагадзіцца. Я добра ведаю мову селяніна. Я памятаю свайго суседа па вёсцы — аратага, а затым партызана — Еўсцігнея. Ен быў кражысты, здаровы чалавек, аб якіх кажуць: нялаўдна скроены, ды моцна зшыты. Усё жыццё ён праводзіў у полі, у лесе, за ўпартай, цяжкой сялянскай работай. І голас яго, натружаны работай, гучаў глухавата, з хрыпотцай.

У Тараса прыжмуранае, недаверлівае вока; ён цяжкадум, ён па-сялянску скрытны; ён доўга правярае вокам кожнага чалавека, з якім гаворыць. Так трэба. Вельмі часта білі яго і памешчык, і спраўнік, і фельдфебель, і цяпер «рэволюцыянеры»-эсэры. Па-дзіцячаму простым і даверлівым становіцца позірк Тараса толькі пасля сустрэчы з Леніным, калі праўда, якую ён так доўга шукаў знойдзена ім. Скінуты з плеч годы нястачы, не стала цяжкіх сялянскіх дум, — вось чаму ў апошняй сцэне сустрэчы з Леніным Тарас выпрамляецца і лёгка, бадзёра вядзе разам з Кузьмом атрад балтыйцаў на штурм Зімняга палаца. Перад ім ясная мэта, — вось чаму ўпэўнена, пераканаўча ён гаворыць: «Доўга шукаў праўду і тут знайшоў яе. Дзякую, таварыш Ленін. Вядзі, Кузьма, цяпер мы знішчым усё, што стане на шляху нашым».

Новы рытм жыцця, рытм совецкага селяніна знойдзен Тарасам пры сустрэчы з большэвікамі, і гэты новы ўнутраны рытм вызначае яго знешнe.

Мне хочацца тут падзяліцца адной дэталлю. На першым спектаклі я іграў Тараса Галоту з барадой. Такі быў грым, прапанаваны мастаком. Усё гэта супярэчыла ўнутранаму вобразу, створанаму мною. Я ўважліва ўглядаўся ў сябе і бачыў у люстры не ласкавага, поўнага гумару і мяккасці украінца, а нейкага дзіўнага выгляду не то партызана, не то акультурыўшагася селяніна, і бясспрэчна рускага па нацыянальнасці. Грым па майму настаянню быў зменен. Барада была знята. Так было бліжэй да жыцця. Замест барады я надаў непаголенасць майму твару і вонкавая змена вобраза адразу развязала мяне. Не стала мышачнага напружання, з'явілася мяккасць мовы, абыходжання, паявіўся гумар і мне адразу стала лёгка.

Я расказаў аб гэтай дэталі таму, што часта ў нашай акторскай практыцы бывае, што якая-небудзь адна вонкавая дэталь вельмі перашкаджае праяўленню ўнутранага вобраза. Мой уласны прыклад паказвае, як дасканала трэба адносіцца да ўсяго, пачынаючы ад грыму і канчаючы касцюмам.

Я буду рад, калі гэты артыкул дапаможа акторам братняй рэспублікі ў іх рабоце над шматграннымі вобразамі нашай совецкай рэчаіснасці.

РЭЗЧЫК ПА ДРЭВУ БАРЫС ХРУШЧОЎ

На Ўсебеларускай выстаўцы народнай творчасці, прысвечанай 20-й гадавіне Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, увагу наведвальнікаў прыцягнуў масіўны бюст вялікага праваднра народаў таварыша Сталіна. Бюст быў зроблен з аднаго кавалка дрэва — ліпы і меў каля метра вышыні і каля двух пудоў вагі. Старанная апрацоўка ліній твару і галавы, падабенства бюста да партрэтаў—усё гаварыла не толькі аб вялікай крапатлівай рабоце, але і аб незвычайных здольнасцях рэзчыка.

Хто-ж выразаў гэты выдатны бюст? Рэзчыкам аказаўся селянін з вёскі Тэхцін, Калінаўскага сельсовета, Бялыніцкага раёна, былы пастух, а зараз вясковы шавец **Барыс Міхеевіч Хрушчоў**, 39 гадоў.

Яшчэ будучы хлапчуком—пастухом, ён любіў вырэзваць з дрэва розныя рэчы — сталы, крэслы, птушак і г. д. — усё, што траплялa яму на вочы. Ен рэзаў простым нажом і калі тупіў ці ламаў нож, нямала папрокаў меў ад бацькі. Але на яго захапленне глядзелі як на дзіцячую гарэзнасць і не перашкаджалі. Не перашкаджалі яму рэзаць і тады, калі ён пачаў хадзіць у вясковую школу. Але пасля сканчэння школы бацька заявіў яму, што разьба па дрэву — гэта «дзіцячыя цацкі», што час выкінуць гэта глупства з галавы і падумаць аб прафесіі, тым больш, што адна дзесяціна ніяк не магла пракарміць сям'ю з сямі душ. Ды і суседзі заўсёды смяяліся з Барыса, што ён губляе час на бескарысныя дробязі. Ен паслухаўся бацькі і да 1930 года не дакранаўся да разца.

Велізарны ўздым культуры Беларускай ССР не прайшоў міма вёскі Тэхцін. Вясковы шавец Барыс Хрушчоў, наглядаючы як з народнай гушчы прабіваюцца ўсё новыя і новыя таленавітыя самародкі і што гэтыя народныя самародкі сустракаюць спачуванне і дапамогу совецкай улады, успомніў, што ён калісьці вельмі ўдала ператвараў бясформенныя драўляныя абрубкі ў «жывых» звяроў, птушак і нават людзей. Зразумела, гэта быў пройдзены этап. Барыс Хрушчоў разумеў, што рэзаць «наогул» зараз нецікава. Яго хвалявала думка — стварыць вобразы людзей, імёны якіх на вуснах, ва ўсіх людзей, якія вялі і прывялі народы СССР да шчаслівага, радаснага жыцця, людзей, якія стварылі нябачаныя ўмовы для пышнага росквіту народнай творчасці

І першую сваю новую работу Барыс Хрушчоў прысвяціў вялікаму Леніну. Ен выразаў з бярозы статую Леніна ў поўны рост, у гарнітуры. Ен прывёз гэту статую на Першую Ўсебеларускую сельскагаспадарчую выстаўку, дзе яна атрымала ўсеагульную ўхвалу.

Потым, па заказу Бялыніцкага райвыканкома, ён выразаў бюст Леніна. Да юбілея А. С. Пушкіна ён выразаў бюст юбіляра.

Нарэшце, ён узяўся за работу, аб якой марыў апошнія годы. Ен пачаў вырэзваць бюст таварыша Сталіна.

Цяпер суседзі ўжо не смяяліся з яго, а часта прыходзілі глядзець (і глядзець з павагай), як ён працуе.

Журы Ўсебеларускай выстаўкі ўхваліла і ацаніла яго работу. Бюст набыў Дом народнай творчасці БССР (за 700 рублёў), а аўтара яго прэміравалі 200 рублямі.

Гэта матэрыяльная дапамога аказалася не адзінай. Дом народнай творчасці яшчэ двойчы аказваў яму матэрыяльную дапамогу.

Матэрыяльная забяспечанасць, магчымая толькі ў шчаслівай краіне Советаў, дапамагла Хрушчову аддаць любімай справе — разьбе па дрэву — больш часу.

Зараз Барыс Хрушчоў працуе над новым творам. Ен робіць фігуру наркома абароны СССР, маршала Совецкага Саюза К. Е. Варашылава на кані. Работа гэта будзе паслана на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку.

Потым тав. Хрушчоў задумаў выразаць фігуру калгасніцы ў нацыянальным касцюме...

Тэм і ідэй у тав. Хрушчова шмат. Увага да яго і яго поспехаў з боку кіруючых арганізацый і ўстаноў натхняе яго на новыя творы.

Разам з тым тав. Хрушчоў адчувае, што яму яшчэ шмат чаго нехапае. Па-першае, яму патрэбна, як ён сам заяўляе, палітычна падкавацца, лепш пазнаёміцца з мастацкай і спецыяльнай літаратурай. Між тым, у вёсцы Тэхцін да гэтага часу няма бібліятэкі, не заўсёды можна знайсці тое, што патрэбна.

Па-другое, цяжка набываць інструменты і матэрыялы. Тав. Хрушчову патрэбны разцы, пласцелін для эскізаў. Ні ў вёсцы, ні ў раённым цэнтры, ні нават у Менску разцоў і пласцеліну няма. Іх можна набыць толькі ў Маскве і Ленінградзе. Але Дом народнай творчасці БССР і гандлюючыя арганізацыі не клапоцяцца аб такіх рэчах.

І. ВОЛГІН.

ВАРЫМСЯ ВА ЎЛАСНЫМ САКУ

(Пісьмо з Уваравіч)

Уваравіцкі драмгуртток пачаў працаваць у 1932 годзе, але да 1935 года ў яго рабоце было шмат перабояў у сувязі з ад'ездамі раду ўдзельнікаў. Цяпер гурток мае сталае ядро выканаўцаў, у асноўным служачых уваравіцкіх устаноў. Узрост удзельнікаў гуртка — ад 18 да 63 гадоў. Напрыклад, тав. Фігліна мае 63 гады, Галакціёнаў—60 год, Барысевіч—43 гады і г. д.

За апошнія два гады гурток паставіў п'есы «Юбілей», «Мядзведзь», «Сватанне»», «Не было ні гроша, ды раптам алтын», сучасныя п'есы: «Зямля», «Знатны ўнук»», «Пралічыўся», «Кветкі», «Падругі» і шмат іншых.

Сярод гуртткоўцаў ёсць вельмі здольныя таварышы,—напрыклад, Каськова, Грыцкоў, Фігліна, Саўчанкава, Галакціёнаў, Казлоў, Барысевіч. Яны іграюць асэнсавана і прыгожа, гледачы іх любяць. З такім складам гуртка можна-б было зрабіць багата. Але ёсць прычына, якая зрывае сістэматычную пастаноўку п'ес. Большасць членаў гуртка—служачыя, яны часта прапускаюць рэпетыцыі—то ў сувязі з камандыроўкай, то з-за вячэрняй работы. Да таго-ж некаторыя загадчыкі ўваравіцкімі ўстановамі кажуць сваім падуласным драмгуртткоўцам: «вы—артыст ці служачы? Выбірайце адно што-небудзь».

Дом народнай творчасці БССР неяк даведаўся аб нашым існаванні і камандыраваў да нас для першага знаёмства свайго работніка тав. Сакалоўскага. Апошні правёў з намі цікавую гутарку, абяцаў не забываць і... паехаў. Гэта быў адзіны візіт да нас работніка Дома народнай творчасці.

Кіраўнік уваравіцкага драмгуртка
А. П. ПАДОЛЬСКІ.

„САБАКА НА СЕНЕ"

у Маскоўскім тэатры Рэволюцыі

Неапаль. Ноч. Зала графіні Дзіаны пустуе. Раптам сюды з'яўляецца Тэадоро і яго слуга Трыстан. Яны прышлі на спатканне да служанкі графіні — Марселы. Аб гэтым даведалася Дзіана, таму і ёй не спіцца. А далей падзеі разгортваюцца так: графіня Дзіана «адбіла» ў Марселы свайго-ж сакратара Тэадоро і выйшла за яго замуж. Зрабіць гэта не перашкодзілі ёй нават багатыя любоўнікі—граф Федэрыко і маркіз Рыкардо. Такі рэзультат не абышоўся без стараннняў Трыстана, які ўмяшаўся ў палюбоўныя справы гаспадара і, каб не разладзіць шлюбу, зрабіў Тэадоро дваранінам, аб'явіўшы яго сынам графа Людовіка, таго Людовіка, які дваццаць год назад сапраўды згубіў сына. Любіў Трыстан Тэадоро, паважаў яго, таму і ўсе справы пана былі ў парадку.

Цудоўная камедыя «Сабака на сене» іспанскага драматурга Лопе дэ Вега поўна жыццёраласнасці, весялосці, дасціпнасці камедыйных палажэнняў. Нягледзячы на тое, што камедыя высмейвае звычаі іспанскага дваранства XVI стагоддзя, тэма кахання, на якой трымаецца ўвесь сюжэт п'есы і з якога так разумна сплецены ніці інтрыгі, застаецца асновай спектакля. Відаць, што аўтар абараняе прадстаўнікоў дэмакратыі. Аднак і дваран ён рэзка не асуджае. Лопэ дэ Вега толькі імкнецца выкрываць недахопы, якія існуюць у жыцці дваранства.

Тэатр паставіў камедыю рэалістычна.

Пастаноўшчык В. Н. Власаў і рэжысёр — заслужаная артыстка рэспублікі М. І. Бабанава з мастацкім тактам распрацавалі камедыйныя сітуацыі. пад крэслілі жыццёрадаснасць і жыццёвасць п'есы, проста падышлі да мізансцэніравання спектакля. Усё гэта забяспечвае добрае ўспрыняцце спектакля. Камедыя задавальвае гледача, яна выклікае разумны і здаровы смех. Нават такія камедыйныя адценні, як гратэск некаторых сцэн і персанажаў, нікольні не перашкаджаюць камедыі, а, наадварот, робяць спектакль яшчэ цікавейшым і больш маляўнічым. Дадатны бок спектакля «Сабака на сене» ў тым, што ён з'яўляецца ва ўсіх сваіх мастацкіх сродках адзіным. Весялосць, жыццёрадаснасць, цёплая камедыйнасць, якія леглі ў аснову пастановачнага плана спектакля яшчэ мацней падкрэсліваюцца музыкай, мастацкім афармленнем і акторскім выкананнем.

У мастацкім афармленні, якое зроблена мастаком В. А. Фаворскім, відаць глыбокае вывучэнне эпохі. Разам з тым фарбы ўжыты найбольш светлыя. Рознакаляровасць касцюмаў расквечвае спектакль празрыстым пачуццём радасці.



Зал. арт. рэсп. М. Бабанава ў ролі Дзіаны.

Зарысоўка **А. Кастамалоцкага.**

Ігрывыя мелодыі музыкі (кампазітар (І. М. Мееровіч) надаюць спектаклю весялосць і лірычную цеплыню.

Асноўнае ў спектаклі—работа актораў. Акторы мелі ўдаячны драматургічны матэрыял, а ў якасці рэжысёра выступіла артыстка, якая звярнула шмат увагі на стварэнне раду вобразаў у спектаклі.

Графіня Дзіана ў выкананні засл. арт. рэсп. М. І. Бабанавай—гэта вобраз ігрывай закаханай жанчыны, якая сваё каханне да Тэадоро не выказвае адразу. Яна быццам запіраецца, робіць намёкі, потым не знаходзіць сабе месца ад дзікай рэўнасці да Марселы. Усю гэту гаму пачуццяў актрыса перадае з выключным майстэрствам. Супярэчанні паміж графскай ганарлівасцю і чалавечымі пачуццямі жанчыны актрыса зрабіла асноўную рысаю ролі. Верх бярэ пачуццё жанчыны, усё астатняе робіцца другарадным.

Другім персанажам камедыі «Сабака на сене», які выключна добра зроблен засл. арт. рэсп. Д. І. Орловым, з'яўляецца Трыстан. Гэта традыцыйны камедыйны персанаж і італьянскай, і іспанскай, і французскай камедыі—слуга. Ен заўсёды разумны, вынаходлівы і своеасаблівa хітры. Безумоўна, што Лопэ дэ Вега пры напісанні гэтага персанажа меў на ўвазе дзеючых асоб камедыі дэль артэ—слугу Труфальдзіно і доктара Панталонэ. Актор Орлоў знаходзіць сярод усіх фарб слугі, як характэрную, некаторы гратэск. Такі разумны чалавек, як Трыстан можа ісці на ўсё, абы яго кішэня была поўна грошай. Разам з тым Трыстан чэсны і чалавечны больш за ўсіх дзеючых асоб. Вобраз разумнага слугі-весельчака надоўга застаецца ў памяці гледача. Актор стварыў тыповы вобраз слугі XVI стагоддзя.

Трапныя ролі створаны акторамі А. П. Лук'янавым (Тэадоро), А. І. Волгіным (Марсела).

Цікавыя камедыйныя вобразы слуг Дзіаны—Даратэі (М. А. Пракоф'ева) і Фабіо (А. С. Белоў). графа Федэрыко ў выкананні А. А Ханава і графа Людовіка ў выкананні Н. Л. Кейль.

Спектакль «Сабака на сене» пакідае жыццёрадасны настрой, што найбольш сугучна совецкаму гледачу. Камедыя Лопэ дэ Вега ў пастаноўцы Маскоўскага тэатра Рэволюцыі карыстаецца вялікім поспехам у гледача Менска. Гэта сапраўды каштоўны спектакль.

А. ЕСАКОЎ.

ОЙ, ШУМІ ТЫ, РАДУЙСЯ, БЕЛАРУСКІ БОР

З калектыўнай паэмы „Радзіме і праваднру"

Музыка В. ЕФІМАВА



Ой, шумі ты, радуйся,
Беларускі бор.
Узлятай ты, песенька,
Да высокіх зор,

Праляці над гоманам
Спелых каласоў,
Праляці над плошчамі
Шумных гарадоў,

Над Масквой-сталіцаю
Сокалам кружы,
Раскажы ты Сталіну,
Роднаму скажы,

Што жанкі шчаслівыя
Радасна жывуць,
Што яму ад сэрпайка
Прывітанне шлюць.

Ой, шумі ты, радуйся,
Беларускі бор.
Узлятай ты, песенька,
Да высокіх зор!

ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ БУДОЎЛЮ ВЯЛІКАГА ТЭАТРА РАБОЧАЙ СІЛАЙ

На будоўлі Вялікага тэатра оперы і балета БССР вельмі напружанае становішча. Найбольш буйныя аддзелачныя работы яшчэ не пачаты. Гэта — знадворная штукатурка, электраабсталяванне, малярныя работы. Шмат работы засталося па абсталяванню будынка.

Усе гэтыя работы ўзначальваюць субпадрадчыкі — кантора аддзелачных работ Белпрамбудтрэста (кіраўнік тав Віглорчык), Беларуская кантора «Электрапрома» (кіраўнік тав. Чэрняеў), трэст «Спрынклер» (Масква), Беларускае аддзяленне «Спецстроя» Наркамлегпрома СССР (кіраўнік тав. Шынкароў), «Мосспецстрой» і інш.

Вельмі слаба пасоўваюцца работы, выконваемыя будаўнічай канторай самога тэатра, у тым ліку чыстая аддзелка ўнутры будынка, механізацыя сцэны, абліцоўка дрэвам, знадворныя работы пабудова бетонных бакаў для вады і г. д. Карацей кажучы, **з двух мільёнаў рублёў**, асігнаваных на работы 1938 года, **асвоена толькі 550 тысяч.**

Будаўнічыя матэрыялы для ўсіх работ, за выключэннем электраабсталявання, ёсць у дастатковай колькасці Такім чынам, будаўніцтва магло быць разгорнута поўным ходам. Але гэта ў тым выпадку калі-б быў патрэбны лік рабочых. Нажаль, Белпрамбудтрэст (кіраўнік т. Кляшторны), які абавязан забяспечыць будоўлю рабочай сілай, вярбовачную кампанію сарваў. Замест шасцісот рабочых, патрэбных паводле апошняга графіка, на будаўніцтве лічыцца ўсяго 160 чалавек.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР намецілі цвёрдыя тэрміны сканчэння будаўніцтва: унутраная аддзелка тэатра павінна быць скончана да 1 жніўня, усе работы — да 1 верасня 1938 года. Каб выканаць гэта заданне, патрэбен ужо **новы графік работ** — чацверты па ліку. Колькасць рабочых павінна быць неадкладна даведзена **да 800 чалавек, у** тым ліку патрэбны: 120 штукатураў — замест наяўных 8 чалавек, 60 цесляроў — замест цяперашніх 11, 260 чорнарабочых — замест 60. 30 сталяроў замест 15 і г. д.

Нельга таксама не адзначыць, што да гэтага часу заказчык будаўніцтва — Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР (кіраўнік тав. Патапейка) не заключыў дагавора з будаўнічай арганізацыяй на работы 1938 года. У сувязі з гэтым Комунальны банк, пачынаючы з 1 чэрвеня, спыніў фінансаванне будаўніцтва Вялікага тэатра. Гэта можа стварыць у бліжэйшым будучым для будаўніцтва вельмі сур'ёзныя фінансавыя перашкоды.

П-н.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. 'п. Галоўлітбела № К—5544.